Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 22 (2768) Год LIV | Беласток, 31 мая 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Праспяваць малітву

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

XXVIII Міжнародны фестываль царкоўнай музыкі „Гайнаўка-2009” 20 траўня адкрыў маршалак Падляшскага ваяводства Яраслаў Дважанскі, а чатыры дні пазней закрыў яго дырэктар мерапрыемства Мікалай Бушко. Паміж іхнымі двума сказамі змясціліся не толькі багацце царкоўнай музыкі, але перш за ўсё пачуцці ўсіх, якія хаця б на момант наведалі канцэртныя залы. Магутныя гукі разносіліся ў евангеліцка-аўгсбургскіх касцёлах Варшавы і Венграва, харысты прэзентаваліся ў Мар’яцкім касцёле ды ў айцоў францысканцаў у Кракаве, два дні харамі захапляліся таксама жыхары і турысты ў Белавежы, дзе паралельна з фестывалем у мясцовым каталіцкім касцёле прайшлі Дні духоўнай музыкі. Усе хары канчаткова з’язджаліся ў Падляшскую оперу і філармонію, дзе чакалі іх журы і верная публіка.

— Девушки, прекрасно! — захапляліся канцэртам жанчыны, пакідаючы Падляшскую філармонію і оперу пасля першага дня конкурснага праслухоўвання хароў.

Ляпалі па плячах, гладзілі па валасах, а дзяўчаткам цяклі слёзы.

— Не да канца атрымалася так, як хацелі, а і такі рэпертуар...

Першы дзень конкурсных праслухоўванняў завершыў хор „Cantatus Juventae” з мінскага Лінгвістычнага ўніверсітэта, які пакінуў след у душы кожнага слухача.

— Так прыгожа выканалі гэтага Бартнянскага, — каментавалі выступ гледачы.

Гэта першы раз, калі я так непасрэдна пабачыла (бо разумела ўжо здаўна), што гэты фестываль не толькі для людзей праваслаўнага веравызнання, разумеючых словы малітвы. Перавядзенне фестывалю ў Беласток спрычынілася да зусім новага ўспрымання яго сэнсу і вартасці. Кола любіцеляў царкоўнага спеву значна пашырылася. На працягу некалькіх травеньскіх дзён беластоцкая філармонія як магніт прыцягвае сапраўдных меламанаў, якія шукаюць новых якасцей. Насустрач выходзяць ім перш за ўсё арганізатары, запрашаючы самыя выдатныя хары свету. У іх выкананні чуем лепшыя кампазіцыі царкоўнай музыкі. Але не ўсё заключаецца ў майстэрстве выканання. У царкоўнай музыцы не абысціся без духовай падрыхтоўкі, таму выканаўцы на безупынным шляху да дасканаласці.

— Нам не хапае духовага настрою, — сказаў дырыжор кракаўскага хору, лаўрэат другога месца ў катэгорыі свецкіх хароў, — але мы гэта разумеем і стараемся маліцца як толькі зможам. Не пакінем аднак царкоўных песень, бо яны незвычайныя.

Аднак не ўсіх выканаўцаў з Польшчы царкоўная музыка ўражвае, гэта ж толькі конкурс...

— Я нават не ведала, дзе шукаць нотаў, што гэта за кампазітары, з якога стагоддзя, — жалілася адна дырыжорка другой.

Мабыць, і з думкай пра людзей несвядомых скарбаў харавой музыкі стваральнікі фестывалю раскрываюць штогод прызабытыя біяграфіі. Выдатным прыкладам гэтаму з’яўляецца сёлетні юбіляр Канстанцін Горскі (1859-1924). Лічыцца ён польскім кампазітарам і хормайстрам, але нарадзіўся ў Лідзе, пра што забылі пэўна і самі беларусы. Помняць затое расіяне, палякі і ўкраінцы. Горскі вучыўся ў Гродне, але пасля ўжо пад вокам Мікалая Рымскага-Корсакава ў Санкт-Пецярбургу. Пакуль пераехаў у Познань, шмат гадоў працаваў у Харкаве. Тое, што атрымалася ў час адкрыцця фестывалю, здавалася неверагодным, бо твор „Бачыўшы мяне маўклівага” („Зряще мя безгласна”) Канстанціна Горскага выканалі супольна чатыры хары: з Мінска, Беластока, Санкт-Пецярбурга ды Харкава. Адна кампазіцыя спалучыла чатыры народы, прыгадваючы гукам жыццёвы шлях Горскага. Традыцыя царкоўнай музыкі сустрэлася з нейкім амаль касмічным авангардам ва „Урачыстай літургіі” Лэсі Дзічко, якую з нагоды яе юбілею выканаў Акадэмічны камерны хор імя Вячаслава Палкіна з Харкава. Лэся Дзічко большасць літургіі сядзела з закрытымі вачыма.

— Гэта было з майго боку сапраўднае перажыванне, мне ўвесь час збіраліся слёзы, — распавяла мне прафесар Лэся Дзічко. — Гэтае выкананне немагчыма разглядаць у нейкіх катэгорыях, яно было дасканалае.

Не адна прафесар сёлета паказала эмоцыі. Колькасць дзіцячых і моладзевых хароў вязалася з новымі ўражаннямі. Са сцэны амаль усе ўкраінкі з хору „Вогнык” сыходзілі са слязамі.

— Надта пераймаліся выступам, — расказвалі адна праз другую. — Мы не спадзяваліся, што на конкурсе будзе столькі гледачоў і што так цёпла будуць нас успрымаць.

Інакш перажывалі свой выступ дзевяцігодкі з эстонскага хору старавераў з маленькага гарадка Колка.

— Я адчуваю сябе як у небе, — сціпленька сказала адна з іх. — Мы ўпершыню на такім вялікім фестывалі, на такой сцэне.

Для такіх малых выканаўцаў фестываль мае смак прыгоды, але большасць дзяцей і моладзі расказвала пра духовае вымярэнне гэтага мерапрыемства. Хаця не спяваюць у цэрквах, адчуваюць незвычайнасць рэпертуару.

— Я цешуся, што гэты фестываль увайшоў на вялікія канцэртныя залы, — сказаў прафесар Рамуальд Твардоўскі, нязменны кіраўнік журы. — Зараз фестываль мае шанс развівацца шматбакова.

— Але жаль, што ўсё ж такі не можам пры нагодзе хваліць Бога ў цэрквах, — дадае дырэктар фестывалю, а як рэха за ім паўтараюць шматлікія слухачы.

Затое на фестываль адкрыліся касцёлы ўсёй Польшчы і зараз там можам пабачыць наведвальнікаў канцэртаў, якія хрысцяцца па-праваслаўнаму.

Калі ў 2006 годзе ў час фестывалю выканана была „Ютрань” Кшыштафа Пэндэрэцкага, здавалася мне, што цяжка будзе прыдумаць чарговыя рарытэты, але тых у гэтым годзе, думаю, хапіла ўсім. Закрыццё фестывалю паказала, што прыгажосць схаваная ў самых простых жэстах, і калі чатыры знакамітыя хары праспявалі ўсім „Многая лета”, то магутнасць і кранальнасць выканання ды людскога голасу прарвала тонкую мяжу між людскім і боскім.

ЗАПРАШЭННЕ

ТАМ ПО МАЁВУЙ РОСІ

VI Падляшска-Палескі фестываль традыцыйнага фальклору

28 мая (чацвер)
Музей у Бельску-Падляшскім — ратуша
14.00 — Адкрыццё выставы народных творцаў Берасцейшчыны (Беларусь), сяброў клуба „Скарб”
Прадмесце Студзіводы
17.00 — Вулічны карагод з абрадам „куста”.

29 мая (пятніца)
Музей Малой айчыны ў Студзіводах
14.00 — Адкрыццё выставы скульптур і малюнкаў Івана Супрунчыка з Цярэбліч каля Століна. Прэзентацыя і кірмаш прац народных творцаў Берасцейшчыны. Прэзентацыя ганчарнага цэнтра з Гароднай каля Століна (Палессе, Беларусь).
16.00 — Канцэрт традыцыйнага фальклору з удзелам выканаўцаў са Столінскага і Драгічынскага Палесся: „Журавушка” з Атвержыч і трыо сясцёр Лук’яновічанак з Леснікоў; з Латвіі: ансамбль сям’і Клінтсаў ды Падляшша: м.інш. „Арэшкі”, „Збучанкі”, дзіцячыя і маладзёжныя групы.

30 мая (субота)
Музей Малой айчыны ў Студзіводах
15.00 — Вясельны абрад з удзелам выканаўцаў з Палесся і Падляшша.
18.00 — Канцэрт капэлы „Вэрэнька” са Стахава (Столінскае Палессе, Беларусь) ды калектыву „Рада” з Мінска.

31 мая (нядзеля)
вёска Мора Чыжоўскай міны
14.00 — Карагод і канцэрт калектываў з Палесся і Падляшша.

Віктар Швед у КЦБ

Культурны цэнтр Беларусі ў Беластоку, вул. Модлінска, 2, запрашае 1 чэрвеня 2009 г., а гадз. 17.00 на прамоцыю новай кнігі Віктара Шведа „Смяшынкі” і выступленне дзяцей з Пачатковай школы № 4 у Беластоку.

9 770546 196000

Усмешка Ільіча

Мне патэлефанаваў калега:

— Прывітанне! — сказаў ён. — Тут у дзяржаўнай беларускай прэсе зноў сталі з'яўляцца артыкулы пра помнікі Леніну. Пішуць, што па выглядзе гэтых помнікаў можна вызначыць як выглядае горад. Маўляў, калі помнік усміхаецца, то і горад прыветлівы і ласкавы, калі помнік чысты, дагледжаны, то і горад такі ж, і гэтак далей. Ведаю, што ты калісьці быў адным з ініцыятараў па збору подпісаў за тое, каб у Гродне прыбралі з плошчы помнік Леніну. Цікава, якія прычыны чаму яго прыбіраць не трэба агучылі тады? Можа такія ж як зараз, ці што іншае?

— Не, — адказваю. — Не такія. Такіх містычных доказаў тады не прыводзілі. Хірамантыя па выглядзе помнікаў — з'ява новая. Тады адказалі проста: маўляў, архітэктурны ансамбль плошчы будаваўся суцэльна з помнікам і пад выгляд манумента Уладзіміру Ільічу. І калі помнік перанесці, то разбурыцца ўнікальная і непаўторная архітэктурная цэльнасць. Зразумела, — працягваю, — што прычына надуманая, але яшчэ не настолькі цынічная, як сцвярджэнні таго, што па выглядзе каменнага ідала можна вызначаць аблічча беларускіх гарадоў.

З таго часу як сотні гродзенцаў паставілі свае подпісы за перанос помніка Леніну прайшло багата часу і безліч падзей. І палітычных, і архітэктурных. Плошчу Леніна ў Гродне ўжо неаднаразова перарабілівалі і мянялі яе аблічча. Гаворачы словамі чыноўнікаў, кардынальна мянялі першапачатковы архітэктурны ансамбль. Ды і не толькі на той плошчы, але і на ўсіх іншых плошчах, вуліцах і завулачках. Не пашкадавалі ні ўнікальнага парку на Савецкай плошчы, ні старых прыгожых дрэў, гледзячы на якія наш горад называлі зялёным. Перарабілі шмат чаго. Камусьці тое падабаецца, а ў кагосьці ад таго баліць сэрца. А вось помнік Леніну застаўся стаяць на сваім месцы. Яго не адважыліся перасунуць ні на міліметр. Стаіць і ўсміхаецца.

Ён вельмі дагледжаны. Яго чысцяць, мыюць. Пад ім перыядычна мяняюць мармур. Ён, нібыта вартавы існага палітычнага ладу, стаіць перад абласным і гарадскім выканкамамі кожны дзень вітаючы чыноўнікаў, якія ідуць на працу ўмацоўваць усё той жа існы палітычны лад. І ніхто з іх не турбуецца, што гэты ідал — насмешка над беларускімі святынямі, у тым ліку і над такой святыняй як Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, дзе чорным па белым задэкларавана ўсё тое, што так імкнуўся знішчыць кіраўнік савецкай дзяржавы.

Савецкі сацыялістычны лад, які ён стварыў праз кроў і пакуты людзей, не вытрымаў выпрабавання часам. Яго няма, як і той савецкай імперыі, якую заснаваў Уладзімір Ільіч. Бяскласавага, безаблічнага грамадства, якое „важак сусветнага пралетарыяту" імкнуўся навязаць народам шостай часткі сушы, так і не ўдалося ўтварыць. Прыватная ўласнасць, якую Ленін асуджаў, зараз аберагаецца законамі нашай краіны. Прынамсі, так запісана. Задэкларавана ў нас і шматпартыйная палітычная сістэма, і рыначная эканоміка, і свабода сумлення, і выбар рэлігіі. Наша беларускае права, зараз, аберагае ўсё тое, што нішчыў першы кіраўнік савецкай дзяржавы. А наша грамадства асуджае тое, што ён навязваў, і што ён рабіў. А самае галоўнае тое, што ў нашай Канстытуцыі запісана, што Рэспубліка Беларусь — незалежная дзяржава, і яе тэрыторыя не можа быць раздзеленай, чаго Ленін ніколі не прызнаваў, і гандляваў нашай зямлёй з немцамі і палякамі, абы толькі ўтрымаць сваю ўладу.

Дык чаму яго помнікі ў наш час стаяць на цэнтральных плошчах беларускіх гарадоў? Чаму наша ўлада так аберагае яго?

Можа для таго, каб людзі зразумелі, што законы пісаныя не для іх. Не для іх шматпартыйная сістэма, прыватная ўласнасць, дэмакратыя... А для іх толькі застыўшая ўсмешка Ільіча, за якой страх перад уладай, адсутнасць уласнай думкі, рабская пакорнасць... Бо іншае тлумачэнне прыдумаць вельмі цяжка.

Віктар САЗОНАЎ

PS. Даведка для беларускіх чыноўнікаў: Ленін Уладзімір Ільіч (Ульянаў; Ленин; 1870-1924), рэвалюцыянер, расейскі палітычны дзеяч, мысліцель, стваральнік Камуністычнай партыі і заснавальнік Савецкай дзяржавы. (Чалавек і грамадства: Энцыклапедычны даведнік, Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 1998).

Нашае „мульці-кульці"

Шматкультурнасць — гэтае слова можам пачуць апошнім часам пры многіх нагодах: падчас адкрыцця фестываляў, выставак, прэзентацый культурнага багацця Падляшскага ваяводства ды іншых.

З аднаго боку, як кажуць многія лакальныя палітыкі, якія выводзяцца з нашага грамадства (ужываю слова „нашага", бо не заўсёды гэтую „нашасць" асацыююць яны з беларускасцю) змянілася шмат. Чыноўнікі прысутнічаюць у „шматкультурных" мерапрыемствах ужо не толькі перад выбарамі. Увогуле, атмасфера на Беласточчыне спрыяе падкрэсліванню сваёй культурнай адметнасці.

Не сакрэт, што „мульці-кульці" зараз моднае. Варта падкрэсліваць вартасць свайго рэгіёна, спасылаючыся на многія нацыянальнасці, этнічныя ці рэлігійныя групы, якія ў ім пражываюць. І можа фактычна нешта мяняецца. Магчыма, што беларускае грамадства на Падляшшы перастане асацыявацца толькі з царквой, вясковымі фэстамі ды масавай падтрымкай Саюза левых дэмакратаў. Хацелася б, каб веды нашых суседзяў пра нас былі шырэйшымі і не абапіраліся на стэрэатыпы, якія яшчэ некалькі гадоў таму можа мелі штосьці супольнае з праўдай, але зараз яны вельмі далёкія ад яе.

Аднак ва ўсёй гэтай прасторы паяўляецца сумненне. Ініцыятывы, жаданні змен у грамадскай свядомасці намнога больш паспяховыя, калі прэзентуюць ці выходзяць з імі не чыноўнікі, палітыкі, але само грамадства. Цяжка змяніць свядомасць звычайных людзей загадам „зверху". Прагрэс ці змены павінны ісці „знізу", хіба, што разам са словамі будуць ісці таксама дзеянні.

Калі пра шматкультурнасць і багацце, якое з яе вынікае, гаворыцца толькі сярод чыноўнікаў і разам з гэтым не ідуць адукацыйныя дзеянні, нават насустрач як найлепшых намераў, усё гэта трапляе толькі ў пустую прастору. Нехта выйдзе, скажа са сцэны тры сказы-лозунгі пра „мульці-кульці" і на гэтым канчаецца.

Добрым прыкладам гэтаму з'яўляецца адказ, які пачуў я апошнім часам на „шматкультурным" мерапрыемстве. Пабачыўшы беларускія матывы на вышываных ручніках, папытаў жанчыну, якая іх прадавала, ці гэта падляшскія беларускія ўзоры. „Не, гэта з Сакольшчыны", — пачуў я ў адказ. І ў ніякі спосаб не вынікала гэта з антыбеларускасці мае суразмоўніцы. Гэта проста недахоп ведаў.

Усе лозунгі пра багацце і шматкультурнасць гэтых зямель, якія выходзяць „зверху", не будуць мець ніякага сэнсу, калі разам з імі не пачнуцца адукацыйныя дзеянні. Цікавае, што ў рэгіёне, у якім беларусы, татары, літоўцы жывуць спакон вякоў, ніхто нават не думае пра адукацыю.

У Заходняй Еўропе, у краінах, у якіх шматкультурнасць гэта вынік толькі апошніх дзесяцігоддзяў, улады дбаюць пра тое, каб наймалодшыя ведалі чаму побач іх жывуць прадстаўнікі іншых рэлігій, нацый, рас і чым характэрныя гэтыя рэлігіі ці нацыі. Яшчэ зарана падводзіць вынікі гэтых дзеянняў (напрыклад, у Іспаніі заняткі такога тыпу вядуцца толькі два гады), але прынамсі відаць спробы зрабіць нешта станоўчае ў гэтым напрамку.

Паколькі ў Бельску ці Гайнаўцы няма праблем са свядомасцю шматкультурнасці, у Беластоку хіба не выглядае гэта найлепш. Варта было б у школах сталіцы Падляшскага ваяводства на занятках па ведах аб грамадстве зрабіць апытанне пра нацыянальныя меншасці, якія жывуць побач, тут, разам.

Нейкую ролю ў гэтым адыгрываюць таксама самі меншасці. Варта, каб нашы ініцыятывы і дзеянні накіроўваліся не толькі да саміх сябе, але выходзілі таксама на шырэйшую прастору, каб фактычна пачаліся нейкія змены ў свядомасці шырэйшых кругоў грамадства.

Адукацыйны працэс мог бы прынесці таксама дадатковую карысць, а менавіта аслабіў бы некарысныя стэрэатыпы аб нацыянальных меншасцях. Стэрэатыпы найчасцей вынікаюць проста з недахопу ведаў.

Вядома, што не ўсё змянілася б адразу. Магчыма нават, што лозунгі пра шматкультурнасць гэта пачатак змен на лепшае. Варта сачыць за гэтым працэсам, каб фактычна гаворка аб шматкультурнасці стала пачаткам свядомага сваёй шматкультурнасці грамадства.

Міхась СЦЕПАНЮК

Вачыма еўрапейца

Касыя вочы беларусаў

Ну і вось у чарговы раз вярнулася справа дэзідэрата сеймавай камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей, датычнага фінансавай падтрымкі пабудовы „Помніка праваслаўным жыхарам Беласточчыны забітым, закатаваны і загінуўшым у 1939-1956 гадах" (яго пабудову ініцыяваў грамадскі камітэт яшчэ ў 1997 г.). У гэты раз адказ на рукі маршалка Сейма Браніслава Камароўскага надышоў ужо ад трэцяга адрасата — у гэты раз ад старшыні Рады Міністраў, а ў прынцыпе зноў з Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны, якога віцэ-міністр Тамаш Мэрта адказаў па ўпаўнаважанні прэм'ера. Падобныя ў сваёй сутнасці адказы камісія разглядала ўжо ў лістападзе мінулага года (адказ якраз МКіНС) і пазней сёлета ў сакавіку (адказ з Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі). Падобна як у ранейшым адказе МКіНС, так і цяпер прадстаўнікі ўрада не бачаць магчымасці дафінансаваць пабудову помніка. Віцэ-міністр Мэрта паўтарыў тое, што ў свой час гаварыў Анджэй Пшэвозьнік, генеральны сакратар Рады аховы помнікаў змагання і пакут (РАПЗіТ): „Лакалізацыя помніка на тэрыторыі царквы Св. Духа (тэрыторыі пад юрысдыкцыяй Праваслаўнай царквы ў Польшчы), як і яго характар як аб'екта рэлігійнага культу (капліцы) па фармальна-юрыдычных прычынах робіць немагчымым назначэнне дафінансавання на яго пабудову Радай. Заданні Рады, запісаныя ў законе ад 21 студзеня 1988 г. аб РАПЗіТ, не прадбачваюць падтрымкі пабудовы сакральных аб'ектаў". І ўрэшце ў падвядзенні сцвердзіў: „РАПЗіТ, звяртаючы ўвагу на тое, што прыняцце як крытэрыю выключна рэлігійнага веравызнання ўвекавечання асоб адыходзіць ад паўсюдна прынятых у гэтых адносінах стандартаў, — Рада стаіць на пазіцыі, што прапанаваня формула ўвекавечання можа аказацца зашырокай. На думку Рады трэба было б затым узяць пад развагу мадыфікацыю назвы манумента".

Так вось аказваецца, што Рада, а затым і МКіНС ды прэм'ер прымяняюць „прынятыя ў гэтых адносінах стандарты" яшчэ з часу Польскай Народнай Рэспублікі. Несумненна, намёк аб змене назвы помніка, значыць, пазбаўленне яго прыкметы „праваслаўны", цалкам пярэчыла б інтэнцыям, якія натхнялі стваральнікаў ідэі перш за ўсё ў аспекце сімвалічнага адзначэння адной з гістарычных праўдаў. Падляшскі дэпутат і член сеймавай меншаснай камісіі Яўген Чыквін так пракаментаваў гэты адказ:

— Шкадую, што Пшэвозьнік, бо гэта ён уплываў на змест адказаў на чарговыя дэзідэраты, паставіў міністраў і прэм'ера ў неадпаведнай сітуацыі. Абгрунтаванне РАПЗіТ фальшывае, бо Рада фінансуе ўвекавечанні ў форме крыжоў, якія, зразумела, з'яўляюцца прадметам культу. Гэты помнік-капліца — форма ўвекавечання. Чыноўнікі не могуць вырашаць аб тым, што грамадзяне РП хочуць пісаць на помніках, асабліва калі гэты помнік не мае кантэксту, які адносіцца да цяперашніх міжнародных стасункаў.

Так атрымалася, што неўзабаве да таго, як сеймавая камісія дэбатавала над дэзідэратам накіраваным канчаткова прэм'еру, прысутнічаў я на ўрачыстым адкрыцці шлюза Кужынец і пагранперахода Рудаўка — Лясная на Аўгустоўскім канале. Адна з жанчын (як прызналася, яна полька і каталічка), калі даведалася, што я з беларускай „Нівы", заявіла:

— Але ж пан хіба не беларус?

Стаяўшы побач мужчына (як я зразумеў, таксама паляк і католік) упэўнена дакінуў:

— Напэўна, не: у беларусаў больш касыя вочы.

Гэты сюжэцік рэкамендую адрасатам сеймавага дэзідэрата, якія былі да гэтай пары, і не толькі ім.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Спяклі каравай і праспявалі вяселле

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

На „Вяселле” ў Нарву” прыехалі мы гадзіну да мерапрыемства. Наладзілі яго, згодна з новай традыцыяй, у пятніцу, 15 мая г.г. У цэнтры, каля *рэмізы,* дзе мелі ставіцца спектаклі, круціліся ўжо будучыя сваты, дружкі, свашкі і стойка ў розным узросце. Мясцовыя і вясковыя, з перавагай апошніх.

— Запрашаем паспрабаваць нашы вырабы, — вітае нас Тамара Юшкевіч, дырэктар Дома культуры. І кіруе нас у гасцініцу „Пад акацыяй”. З прыемнасцю прымаем запрашэнне, бо ў месцы, куды нас накіравалі, цягам апошняга тыдня выспявала сённяшняя мастацка-кулінарная праграма. Тут пад кірункам Ніны Абрамюк рыхтавалі спекталь „Сваты”. І не забылі пра асноўную спайку традыцыі: пачастунак і гасціну. Таму разам з пастаноўкай у гасцініцы вяліся кулінарныя курсы.

— У першы дзень мы пяклі гускі і булачкі, — пералічвае Марыся Ляшчынская, апякунка групы, — у другі рыхтавалі мяса на каўбасы, мачылі ў салянцы паляндвіцы і куньпы, у наступны дзень мясілі караваі, круцілі каўбасы, пасля іх пяклі і вэндзілі... Дзеці былі так захоплены, што цяжка іх было адвесці ад работы.

— Як думаеце, — пытаем у жанчын, якія завіхаюцца разам на кухні, — вашы дзяўчаты захочуць, каб ім пяклі каравай на вяселле?

— А хто вам сёння спяваць будзе?! — чую ў адказ сумныя словы. Яны закранаюць сутнасць абраду, бо ў падрыхтоўцы каравая найважнейшыя каравайныя песні. Праз іх жаночая грамада старалася праспяваць шчаслівае і багатае жыццё маладой пары. Таму да выпякання не запрашалі зайздроснікаў і ўдавіц у жалобе. Па выглядзе каравая варажылі ўдачу або паразу будучай пары, а ў апошнім выпадку пяклі новы каравай. І пільнавалі, каб ніхто не пакраў гусак! Нашы продкі моцна верылі ў лёс, хоць адначасова моцна стараліся ўплываць на яго і выпраўляць...

Наколькі нарваўскія караваі цешылі вока і ўсе гускі былі на месцы, мы пахвалілі кухарак і падаліся на спектакль у *рэмізу.* У першых радах ужо выседжвала мясцовая знаць: войт, духавенства, бізнесмены, адміністрацыя. У наш час поспех мерапрыемства чамусьці ацэньваюць па колькасці публікі. Тут спрацавала і якасць, і колькасць. У Нарву з’ехаліся бацькі акцёраў-аматараў, часам з адлеглых куткоў гміны, у якой адна школа. Ды тэатральная група амаль поўнасцю супадае з групай навучэнцаў беларускай мовы.

На першым плане Данель Пятрышык (бацька)

— Тое, што дзеткі і моладзь хочуць выступаць у спектаклях, — кажа Ніна Абрамюк, — гэта плён многіх гадоў. Мы пачынаем ставіць спектаклі ўжо ў наймалодшых класах. Сцэнарый „Сватоў” напісала я на аснове ўспамінаў са сваёй моладасці і расказаў людзей. Пэўныя сцэны ўзяла з Мележавых „Людзей на балоце”, частку прыдумалі з моладдзю ў час рэпетыцый. Каб было па-колішняму, у Нарве прыдумалі сасватаць маладзенькую Тамарку са старым кавалерам Колем. Цікава, што вырашальную ролю тут адыграла не багацце, а геаграфія. Бо найважнейшае, як пасля даказвалі за сталом гаварлівыя сваячкі, каб дзяўчына выйшла замуж у сваю вёску.

Якуб Садоўскі і Тамара Юшкевіч

Абразанне касы маладой

Галоўныя героі: малады (Ева Кананюк) і маладая (Дамініка Юшкевіч) не адазваліся ні словам. Дарэчы, іх паводзіны нікога не здзіўлялі, наадварот, публіка добра ведала, што менавіта так вырашаліся ў нас справы замужжа! Жывы кантакт паміж сцэнай і залай напаўняў верай, што сапраўды яшчэ жыве традыцыя.

— Як ён палівае левай рукой! — крыкнуў нехта з залы, калі на сцэне запівалі толькі што зробленую здзелку. У якасці рэквізітаў ужо чарговы раз для спектакля скарысталі музейныя экспанаты з пансіяната спадара Фільяновіча са Скарышэва, канкрэтна літроўкі, у якіх даносілі на стол вясельную мядуху.

Пасля абраду сватоў згулялі вяселле. Пастаноўку на аснове музычнага матэрыялу з Ласінкі і Крыўца паказала бельская „Жэмэрва”. Згодна са старым звычаем, яны адспявалі вяселле па этапах, якім спадарожнічалі спецыяльныя песні. „Жэмэрве” ўдалося захаваць прыгожа-сумны настрой і характар абраду. Іх мастацкі поспех — у супольным спяванні са спявачкамі з Крыўца і Ласінкі.

Сумна-рэфлексіўны настрой абраду стараліся выправіць вясельныя госці і асабліва стойка. Гэтую сцэну ўдала сыгралі тры нарваўскія гімназісткі: Эмілія Масайла, Аня і Юліта Келбашэўскія. Дзяўчаты адыгралі напоўненыя сакавітым гумарам „Размовы вясельных сватоў”. Дзякуючы ім, кожны глядач пакідаў залу з усмешкай. Пастаноўкі жыва ўплывалі на ўяўленне, наклікалі рэфлексію. Пад іх уплывам апынуўся і сам войт гміны Якуб Садоўскі. Ён распавёў пра сваё вяселле ў пачатку 1980-х гадоў у Барысаўцы і Тыневічах-Вялікіх.

— Калісь то былі вяселлі! Людзі святкавалі ўвесь тыдзень. А што мы маем сёння? Чалавек не паспее сесці за стол, а ўжо яго гоняць на паркет... Пасля зробяць „ачэпіны” і дадому!

Нас таксама падганялі абавязкі, але мы не маглі вызваліцца ад перажытага ў Нарве. У дарозе мы гадалі, чаму ўсе галоўныя гераіні спектакляў з цыкла „Жыве яшчэ традыцыя” — Тамаркі. Ці гэта не своеасаблівы паклон сімпатычнай спадарыні Тамары Юшкевіч, якая ў арганізацыю беларускіх мерапрыемстваў уклала сваё сэрца?!

А. Васілій Рошчанка, Анна Асташэўская, а. Багуміл Карнілюк

Каравай і да каравая...

Адкуль у Белавежы Цэнтура?

Цэнтура — гэта назва пасёлка, які размясціўся на ўсходнім краю Белавежскай паляны. Людзі, якія прыязджаюць у Белавежу, часта задумваюцца адкуль узялася гэтая даволі арыгінальная і няясная назва. Тут трэба нам заглянуць у гісторыю Белавежскай пушчы.

У 1924-1929 гадах Белавежскую пушчу эксплуатавала англійская суполка The Century European Timber Corporation, якую людзі называлі коратка — Цэнтура. Пры нагодзе — англійскае слова „century" абазначае „стагоддзе". Менавіта англійцы і збудавалі ў дваццатыя гады для сваіх чыноўнікаў гэты пасёлак. Пасля разарвання ў 1929 годзе польскім урадам дамовы з гэтай суполкай новазбудаваны пасёлак з пышнымі дачамі пераняла для сваіх працаўнікоў Дырэкцыя дзяржаўных лясоў у Белавежы.

Зараз пасёлак Цэнтура ўваходзіць у склад сяла і салэцтва Стачок. Ад поўначы мяжуе з пасёлкам Вайцяхоўка. Жывуць у ім у пераважнай большасці працаўнікі лясной адміністрацыі і рабочыя з сем'ямі.

У комплексе будынкаў у паўднёвай частцы пасёлка зараз пасля вайны змяшчалася застава Войск аховы пагранічча. Потым, калі заставу перасялілі ў будынкі даваеннага Надлясніцтва Ягелонскае, комплекс гэты займеў Дзяржаўны дом дзіцяці. З 1989 года змяшчаецца ў ім Дом сацыяльнай дапамогі „Ракітнік".

Трохі на ўсход ад Цэнтуры знаходзіцца вялікі кар'ер гравію, заснаваны яшчэ ў міжваенны перыяд, але ён ужо не эксплуатуецца.

Пётр БАЙКО

Новае Ляўкова

Жыве коцік... на могілках

Шаснаццатага мая выпала першая гадавіна смерці майго суседа з Новага Ляўкова Нараўчанскай гміны. Пасля багаслужбы ў царкве ягоныя жонка, дзеці ды ўнукі паехалі на могілкі, паставілі свечкі. І тут дзеці аднекуль прынеслі на руках коціка.

Ад знаёмых я даведаўся, што гэты коцік тут знаходзіцца ад правадной нядзелі. Нехта прывёз яго сюды і пакінуў. Выбраў такі спосаб, каб пазбыцца хатняга звярка. І так ён вартуе могілкі днём і ноччу.

У той жа суботні вечар узяў я лусту жытняга хлеба і жменю сухога корму, які купляю сваім катам. На могілках пайшоў я той сцяжынкай, на якой перад поўднем дзеці гулялі з коцікам. Паклікаў, але яго не было. Вярнуўся я да брамкі, а тут тое ж кацяня бяжыць да мяне. Найперш падаў я яму акраец духмянага хлеба. „Мяў-мяў" схапіў яго абедзвюма лапкамі і пачаў прагна есці. А як хрумсцеў у яго зубках сухі корм! Я з'ездзіў у навакольны лес і праз нейкі час вяртаўся дарогай каля могілак. Малы мурлыка ўсё з'еў і мыўся наслінёнай лапкай, седзячы на надгробнай гранітнай пліце.

Чатырохлапы вартавы ляўкоўскіх могілак не збягае адсюль. Відаць, памірыўся з такім, а не іншым лёсам. Бывае, той-сёй прывязе яму нешта з ежы. Можа, прыйдзе той час і хтонебудзь возьме коціка дадому?

Мой допіс закончу так: „Людзі, не вязіце жывых коцікаў на могілкі. Не пакідайце іх тут на пагібель!" **(яц)**

Каб змагацца за нашы справы

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Набліжаюцца выбары ў Еўрапарламент. Кандыдаты ў еўрадэпутаты наведваюць мясцовасці, каб паразмаўляць з выбаршчыкамі і прадставіць сваю праграму. Наш беларускі кандыдат прафесар Антон Мірановіч наведаў Гайнаўку. Спатканне, арганізаванае 17 мая Беларускім самаўрадавым форумам, адбылося у Гайнаўскім доме культуры.

— Антон Мірановіч, гэта найлепшы кандыдат у нашым рэгіёне, які балаціруецца са спіска наймацнейшай партыі, — заявіў у пачатку сустрэчы старшыня Беларускага самаўрадавага форуму Міхась Андрасюк і голас аддаў дэпутату Сейма ад Грамадзянскай платформы Роберту Тышкевічу, лідару гэтай партыі ў Падляшскім ваяводстве.

— Я прыехаў у Гайнаўку, каб аказаць падтрымку прафесару Антону Мірановічу. Я ўпэўнены, што гэта вельмі добры кандыдат у еўрадэпутаты. Я веру ў Гайнаўку і ў магчымасць выкарыстання патэнцыялу гайнаўскай зямлі, — сказаў Роберт Тышкевіч. Прамоўца звярнуў увагу на магчымасці нармалізацыі адносін паміж Еўрасаюзам і Беларуссю, як у рамках Усходняга партнёрства, так і ў рамках двухбаковых суадносін Польшчы і Рэспублікі Беларусь, паміж якімі знаходзяцца Гайнаўшчына і ўсё Падляшша. Паводле дэпутата Тышкевіча, пры спрыяльных геапалітычных умовах Гайнаўшчына можа развівацца як у гаспадарчым, так і ў культурным плане.

— **Паверце ў праект „Антон Мірановіч — еўрадэпутатам"**, бо прафесар Антон Мірановіч гэта асоба адкрытая, дынамічная, вялікі патрыёт нашага рэгіёна, які ведае патрэбы звычайных людзей, вельмі кампетэнтны ў справах усходняй палітыкі, у якога ёсць шырокія кантакты з людзьмі з Усходу. Я беспячней адчуваю сябе будучы каля Антона Мірановіча, калі гаварыць аб будаванні ўсходняй палітыкі. Ён вельмі добры эксперт хаця б па ўвядзенні бязвізавага руху, павелічэння гандлю з Усходам і таму мы ставім на доўгатэрміновае супрацоўніцтва з прафесарам Антонам Мірановічам, — заявіў Роберт Тышкевіч. — Калі б падвесці яго навуковую, грамадскую і самаўрадавую дзейнасць, а таксама яго міжнародную актыўнасць, трэба было б прачытаць тут больш дзесяці старонак запісаных матэрыялаў.

Дэпутат Роберт Тышкевіч лічыць, што пры высокай яўцы выбаршчыкаў ёсць вялікі шанц, што трох еўрадэпутатаў будзе з нашай акругі, а ў такім выпадку прафесар Антон Мірановіч мае рэальныя магчымасці стаць еўрадэпутатам.

— У Еўрапраламенце павінны быць людзі, якія разумеюць геапалітычную сітуацыю ва Усходняй Еўропе. Гайнаўка можа стаць рэгіёнам інтэнсіўных інвестыцый. Калі будуць узводзіцца фабрыкі, людзі не будуць вымушаны выязджаць за працай, — гаварыў прафесар Антон Мірановіч. — Зараз ёсць вялікія магчымасці, каб карыстацца сродкамі прызначанымі на вышэйшыя навучальныя ўстановы. Еўрасаюз прызначае 200 мільёнаў еўра на стварэнне новых спецыяльнасцей у вышэйшых установах, але мы іх не выкарыстоўваем. Я зараз намагаюся стварыць у нас новую спецыяльнасць „усходнезнаўства". Такая спецыяльнасць створана ў Познані і на адно месца ахвотных там вучыцца было ажно 12 асоб. Спецыялістаў у гэтай галіне, яшчэ як студэнтаў, шукаюць прадпрыемствы, якія супрацоўнічаюць або хочуць супрацоўнічаць з Усходам.

У час перадвыбарчага спаткання ў Гайнаўцы прафесара Антона Мірановіча (пасярэдзіне) успамагалі дэпутат Сейма ад Грамадзянскай платформы Роберт Тышкевіч (справа) і Міхась Андрасюк з Беларускага самаўрадавага форуму (злева)

У дыскусіі першым выступіў бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк, які заявіў, што вельмі важным для жыхароў Гайнаўшчыны з'яўляецца як найхутчэйшае стварэнне бязвізавага прыгранічнага руху, калі на падставе пасведчання з двухгадовым тэрмінам сапраўднасці можна будзе нашым жыхарам выязджаць у Беларусь, у прыгранічную зону да 30 кіламетраў і жыхары Рэспублікі Беларусь будуць прыязджаць да нас на такіх самых прынцыпах. Гэты праект мусіць быць зацверджаны адпаведнымі структурамі Еўрасаюза і таму праблема была закранута ў прысутнасці кандыдата ў еўрадэпутаты.

— Калі б Еўрасаюз адкрыўся на Усход, Гайнаўка магла б стаць месцам, з якога прадпрымальнікі выходзілі б на Усход, а гэта напэўна прыцягнула б у горад вонкавы капітал. Ужо і зараз бізнесмены з Польшчы цікавяцца нашымі кантактамі з Усходам. Мы і зараз супрацоўнічаем з прыгранічнымі раёнамі Рэспублікі Беларусь у рамках Еўрарэгіёна „Белавежская пушча". Нам вельмі важна, каб атрымаць еўрасюзныя сродкі на супольныя з Беларуссю і Украінай праекты, на больш канкрэтныя інвестыцыйныя прапановы з прыгранічнымі партнёрамі ў Рэспубліцы Беларусь. Напрыклад, мы крыху забруджваем рэчку Лясную, якая плыве цераз Камянецкі раён, і мы хацелі б атрымаць сродкі на водна-каналізацыйныя праекты, якія тычыліся б гэтай рэчкі. Я думаю, што кандыдат прафесар Антон Мірановіч ведае, як з усходняй палітыкі зрабіць добры аргумент, каб наладзіць больш шчыльнае супрацоўніцтва паміж намі і Усходам. Мы тады маглі б атрымаць таксама і еўрасаюзныя сродкі, патрэбныя для развіцця Гайнаўшчыны, — сказаў бурмістр Анатоль Ахрыцюк.

Кандыдат у Еўрапарламент Антон Мірановіч адзначыў, што ў Еўрапарламенце хацеў бы хадайнічаць за ўспамаганне рэформ у Беларусі і за больш цеснае супрацоўніцтва Еўрасаюза з Беларуссю, што павінна стаць шанцам для Гайнаўшчыны.

У час дыскусіі паявілася пытанне да кандыдата пра веданне моў і еўрапейскіх структур.

— Гэтае пытанне павінна ставіцца ўсім еўракандыдатам. На Захадзе лекцыі я чытаю на англійскай мове. Горш ведаю італьянскую і латынь. Вучуся французскай мове і ў 50% разумею людзей, якія гавораць па-румынску. Толькі пачаў вучыцца грэчаскай мове, але добра было б заняцца нямецкай мовай, бо гаспадарка Германіі хутка развіваецца і гэтая мова набірае штораз большага значэння ў Еўропе. Калі гаварыць пра Усход, дык ведаю беларускую, расійскую і ўкраінскую мовы. Выступаючы з лекцыямі, пазнаёміўся я з парламентарыямі Латвіі, Грэцыі, Італіі, а займаючыся ў міжнародных структурах, знаёміўся з грамадскай працай і дзейнасцю палітыкаў на Захадзе, бо там нават навуковыя канферэнцыі фінансуюцца бізнесам і адбываюцца з удзелам палітыкаў, чаго яшчэ няма ў нас, — адказаў Антон Мірановіч.

Войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк, выбраны на гэтую пасаду ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта, пажадаў беларускаму кандыдату ў Еўрапарламент Антону Мірановічу перамогі на выбарах. Адначасна звярнуў увагу на праблемы характэрныя яго вясковай гміне.

— На нашых вёсках Еўрасаюз атаясамліваецца часта з непасрэднымі даплатамі да апрацоўваных палёў. Хацелася б, каб даплаты для нашых гаспадароў былі на ўзроўні даплат сялянам краін даўняга Еўрасюза. Аднак гэтых даплат не хапае, каб нармальна жыць, паколькі хутка даражэюць кошты сельскагаспадарчай вытворчасці, — заявіў чыжоўскі войт Юрый Васілюк.

— У Еўрасаюзе паяўляюцца галасы, каб скасаваць непасрэдныя даплаты ўвогуле, але я выказваюся за іх утрыманне. Даплаты, якія пасля маюць зраўняцца з даплатамі для земляробаў краін старога Еўрасаюза, зараз дазваляюць лепш гаспадарыць жыхарам нашых вёсак і з'яўляюцца свайго роду сацыяльнай дапамогай, без якой зараз цяжка было б жыць сялянам, — гаварыў Антон Мірановіч.

— Чым бліжэй да выбараў, я веру, што Антон Мірановіч можа стаць еўрадэпутатам. 7 чэрвеня бяром сямейнікаў і суседзяў і прагаласуйма на свайго кандыдата прафесара Антона Мірановіча, якому ў Еўрапарламент будзе па дарозе праз Гайнаўку, Белавежу, Дубічы, ці Кляшчэлі, а то на нашых спісках паявіліся дэсантнікі з розных рэгіёнаў Польшчы, якім, магчыма, цяжка будзе да нас дабрацца ў будучыні, — заявіў на развітанне Міхась Андрасюк з Беларускага самаўрадавага форуму.

Вузкая брама

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

— Вяртаем Аўгустоўскі канал жыццю. Гэта брама ў Еўропу, — прыўзнята гаварылі ўдзельнікі афіцыйнага адкрыцця шлюза Кужынец і польска-беларускага пагранперахода Рудаўка — Лясная на Аўгустоўскім канале. Тым часам мроі аб вялікім турыстычным руху гэтым шляхам — маларэальныя. Кужынецкі шлюз завузкі і могуць па ім пераплысці можа толькі байдаркі. Матарызаваныя турысты могуць мець таксама клопат з даездам да шлюза па пясчаных і дзіравых асфальтавых дарогах з польскага боку.

Як належыць узнёслай урачыстасці, прамаўлялі афіцыйныя госці, у тым ліку віцэ-міністры аховы асяроддзя Польшчы, Беларусі і Літвы. Польскі віцэ-міністр Станіслаў Гаўлоўскі:

— Сустрэліся мы, каб праз семдзесят гадоў на гэтым адрэзку адкрыць Аўгустоўскі канал. Явіліся мы сюды, каб адзначыць, што адкрываем шлюз у Еўропу, ці інакш — браму ў Еўропу. Адкрыццё гэтага шлюза дазваляе беларускім турыстам уплысці ў Польшчу, а папраўдзе — у Еўропу.

Віцэ-міністр прыродных рэсурсаў і ахвовы навакольнага асяроддзя Беларусі Віталь Кулік прыгадаў:

— Беларускі адрэзак Аўгустоўскага канала быў мадэрнізаваны у адпаведнасці з распараджэннем прэзідэнта Беларусі ў 2004-2006 гадах.

Адзначыў, што Беларусь падыходзіць да разбудовы інфраструктуры Аўгустоўскага канала і Аўгустоўскай пушчы з вялікай асцярожнасцю, па экалагічных прычынах, з апаскай парушэння багацця фаўны і флоры:

— На беларускай тэрыторыі Аўгустоўскага канала знаходзяцца два прыродныя запаведнікі. Цяпер абмяркоўваем заснаванне біясфернага запаведніка, які мог бы знаходзіцца на тэрыторыі трох краін: Беларусі, Польшчы і Літвы.

Віцэ-маршалак польскага Сейма Кшыштаф Путра:

— Людзі мусяць паміж сабой кантактавацца, сустракацца, абменьвацца думкамі, а кіруючыя маюць за заданне ім гэта палегчыць. Мне здаецца, што кіруючыя як з аднаго, так і другога боку знакаміта з гэтым спраўляюцца. Думаю, што неўзабаве супрацоўніцтва паміж нашымі парламентамі таксама будзе пашырана.

Намеснік старшыні гродзенскага аблвыканкама Юрый Масквічоў:

— Гэтая ўрачыстасць — чарговы прыгожы ліст нашай супольнай гісторыі. Урад нашай рэспублікі прыняў комплексны дакумент, датычны развіцця інфраструктуры Аўгустоўскага канала. Рыхтуецца пакет дакументаў, якія маюць на мэце спалучэнне абшару Аўгустоўскага канала са свабоднай эканамічнай зонай, што створыць прыязны клімат для інвестараў, увядзе падаткавыя ільготы. Паводле статыстык, толькі ў мінулым годзе рэгіён Аўгустоўскага канала з беларускага боку наведала больш за 30 тысяч турыстаў, а гэта толькі пачатак.

Выступіў таксама Генрык Язёрскі, пастаянны жыхар Аўгустова, у летнім сезоне пражываючы ў Рудаўцы. Ягоныя словы навакольныя жыхары прынялі апладысментамі:

— Я хачу звярнуць увагу ўладам. Калі будзеце вяртацца з Рудаўкі ў Аўгустаў, прыгледзьцеся гэтаму адрэзку дарогі. Каб развіваць тут турызм, гэтую дарогу трэба проста зрабіць. Гэта магчымае толькі дзякуючы супольным дзеянням ваяводскіх, павятовых і гмінных улад.

У размове з „Нівай" некалькі жыхароў ваколіцы, між іншым Аляксандр Кухажэўскі (які да нядаўна 38 гадоў быў солтысам Рудаўкі), наракалі:

— Добра, што адкрылі гэты пераход. Ды хай штосьці зробяць з гэтай дарогай да пагранперахода!

Сусед былога солтыса дакінуў:

— Ну і рыб зарабанілі нам лавіць, а тут у ваколіцы найлепшыя балоты!

Суседка:

— Мы хочам, каб па гэтым мосце над шлюзам можна было праязджаць на веласіпедах. Быў ён калісьці наш, але нам яго забралі. Казалі, што будзе можна сюдою роварамі аж да Гродна даязджаць, ды цяпер нічога штосьці пра гэта нам не гавораць.

У час кароткай прэс-канферэнцыі віцэ-міністр Гаўлоўскі, у якога мы спыталіся, што зрабіць з праблемай даязных дарог да пагранперахода Рудаўка — Лясная і шлюза Кужынец, адказаў:

— Урад ажыццяўляе праграму падтрымкі лакальных дарог, гэтак званых „схетыновак". Існуе магчымасць дафінансавання з гэтай праграмы таксама тутэйшых дарог. Я папрашу ў пана ваяводы, каб у час наступнага конкурсу апынуліся яны на спіску падтрымкі, вядома, калі выступіць за гэта аўгустоўскі староста.

Пры нагодзе адзначыў:

— Наш урад хадайнічае за тое, каб Аўгустоўскі канал быў занесены як помнік у Спісак сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

У сваю чаргу пасол РБ у Польшчы Віктар Гайсёнак у размове з журналістамі адзначыў:

— Аўгустоўскі канал з'яўляецца нашым супольным багаццем. Мусім зрабіць усё, каб быў ён даступны для людзей і каб фактычна нас спалучыў.

Сярод назіральнікаў урачыстасці сустрэлі мы Войцеха Фартуну, цяпер жыхара блізкай Грачыцы, залатога медаліста Алімпіяды 1972 г. у скачках з трампліна:

— У будучыні павінен адбывацца тут бязвізавы турызм.

Цалкавітая даўжыня Аўгустоўскага канала налічвае каля 102 км (на тэрыторыі Польшчы — 80 км, у Беларусі — 18,5 км). Больш за тры кіламетры складае частка гранічнага пояса з Беларуссю. Існуе на ім 18 шлюзаў (14 на тэрыторыі Польшчы, адзін у памежнай зоне, тры ў Беларусі). Пагранпераход Рудаўка — Лясная быў адкрыты 30 красавіка 2005 г. Адчынены ён з 7 да 19 гадзіны. З дадзеных Падляшскай часці Памежнай аховы вынікае, што з моманту адкрыцця пагранперахода мяжу перасякло тут 468 палякаў і 76 беларусаў, прытым штогод адбываюцца тут байдарачныя паходы ў больш за 40 асоб работнікаў польскай і беларускай памежных служб. Рамонт самога шлюза Кужынец завяршыўся ўжо ў 2007 г. Афіцыйна адкрылі яго, аднак, толькі цяпер, паколькі Рэгіянальная ўправа воднай гаспадаркі (РУВГ) у Варшаве мадэрнізавала яшчэ далейшую частку прыгранічнага адрэзка.

— Мы зрабілі яшчэ адрэзак у тры кіламетры паміж мяжой і шлюзам Кудрынкі, — хваліўся перад журналістамі дырэктар РУВГ Лешак Багінскі.

Пы нагодзе ўрачыстасці падляшскі ваявода Мацей Жыўна перадаў на патрэбы Памежнай аховы дзве патрульныя маторныя лодкі: кабінную і пантонную (коштам у больш за 150 тысяч злотых).

Віцэ-міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя РБ Віталь Кулік (злева) і віцэ-міністр аховы асяроддзя РП Станіслаў Гаўлоўскі адкрываюць шлюз Кужынец

Мае ўражанні ад Дня Перамогі

Мне ў гэтым годзе пашанцавала быць удзельнікам святкавання Дня перамогі ў Беластоку. У суботу, 9 мая, стаяла сонечнае надвор'е. Пасля абеду на могільніку па вуліцы Высоцкага збіраецца штораз больш людзей. А гадзіне 14-й пры магілах савецкіх салдат гуртуюцца дэлегацыі польскіх і беларускіх ветэранаў з вянкамі і кветкамі. Прысутнічаюць прадстаўнікі ваяводскіх і гарадскіх улад Беластока і Гродна, вайсковыя аташэ Беларусі і Расіі, моладзь. Камеры гродзенскага і мясцовага тэлебачання дакументуюць ход мерапрыемства. Перад помнікам загінуўшым салдатам малітву чытаюць святары праваслаўнага, каталіцкага, мусульманскага і іншых веравызнанняў. У руках удзельнікаў памінальнай урачыстасці палымнеюць свечкі. Салдаты Войска Польскага трымаюць ганаровую варту. Павольна над магіламі салдат нясецца прымеркаваная да жалобнай урачыстасці мелодыя.

Пасля ўскладання вянкоў і кветак на магілах арганізатары ўрачыстасці — а былі імі Генконсульства РБ ды мясцовы Саюз ветэранаў і былых палітычных вязняў — запрасілі прысутных у консульства на пачастунак і канцэрт салдацкіх песень. Ветэраны ўспаміналі свае франтавыя дарогі, спявалі песні, танцавалі пад гармонік. Мне ўдалося пазнаёміцца і пагутарыць з вельмі цікавымі людзьмі. На заканчэнне спаткання ўсе прысутныя, стоячы, праспявалі галоўнагаму агранізатару мерапрыемства генконсулу Міхалу Аляксейчыку і яго жонцы „Многая лета".

У час гутаркі з многімі людзьмі розных пакаленняў усплывала адно пытанне: чаму ўлады такіх паветаў як Гайнаўка, Бельск-Падляшскі ці Сямятычы адвярнуліся спіною да колішняй традыцыі арганізавання з духавенствам і мясцовым насельніцтвам урачыстасцей з нагоды Дня Перамогі. Ці ж нам забываць подзвіг салдат, якія загінулі за вызваленне нашай зямлі з-пад нямецкай акупацыі? Думаю, што нашы „тутэйшыя" ўлады павернуцца тварам да свайго святога абавязку не забываць таго, для чаго яны былі выбраны народам.

Віктар БУРА

Гайнаўка

Міні-парк не для аўтамабіляў

У Гайнаўцы кожны год сякуць многа дрэў. У гарадскім парку і на вуліцах. Ажно жах, колькі іх ссеклі па вуліцы Баторыя або Варшаўскай! Раней быў прыгожы невялікі парк па вул. а. Антонія Дзевятоўскага. Тут асталіся прыгожыя старыя дрэвы. І вось вадзіцелі якраз пад імі ставяць свае аўтамашыны. Гэтым самым руйнуюць гэтае прыгожае месца. Найбольш аўтамабіляў бачыў я тут падчас Міжнароднага фестывалю „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі" ад 10 да 16 мая г.г.

А вось побач знаходзіцца вялікая стаянка для аўтобусаў і легкавых аўтамабіляў перад Гайнаўскім домам культуры і другая — каля Свята-Троіцкай царквы. Там трэба ставіць свае аўтамабілі. Там для іх месца.

Міні-парк быў абгароджаны. Зараз па агароджы ні следу. Цікава, хто дазволіў яе зліквідаваць. А мо найлепш было б пабудаваць новую агароджу? І справе быў бы канец.

(яц)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

У касцюме ці без?

Беларускія дзеткі безумоўна ўмеюць спяваць ды складаць сапраўдную канкурэнцыю. Аспрэчыць гэта немагчыма, асабліва, калі нехта хаця б адзін раз удзельнічаў у конкурсе „Беларуская песня" для школьнікаў. Не толькі вучні падставовых школ і гімназій былі героямі сёлетняга мерапрыемства, бо сапраўдныя зоркі растуць ужо ў садку.

— Мы не баімся выступаць, — падкрэсліваюць з усмешкай малышы з садка № 14 у Беластоку. — Пані нам сказала, што калі хтось будзе смяяцца на публіцы, то значыцца, што ён не разумее, а мы маем спяваць сваё.

Хто б падумаў, што некалькігадовыя дзеткі — такія вопытныя выканаўцы.

— Калі паломіцца інструмент, а мне гэта здарылася, таксама трэба далей спяваць, іграць і ўсміхацца, — дадае адна з дзяўчынак.

Школу сцэнічнага выпрабавання прайшоў таксама вучань з Гайнаўкі. У час выконвання песні спыніўся дыск з музыкай. Аднак Матвей Харкевіч даспяваў песню да канца, ужо без музыкі.

— Я не была ў змозе яму дапамагчы, — кажа ўсхвалявана спадарыня Вера, мастацкі кіраўнік школьнікаў з Гайнаўскага дома культуры, — але ўдалося.

Працу Матвея заўважыла журы, узнагароджваючы хлопчыка другім месцам, але быў ён адным з дзесяткаў пераможцаў, бо, здаецца, усе выехалі з Бельска-Падляшскага з узнагародамі. Такі ўжо гэты конкурс. На цэнтральны агляд прыязджаюць самыя таленавітыя дзеці, таму пэўна і жаль пакінуць іх незаўважанымі. А і працы шмат. І нерваў. І неспадзяванак.

— Чаму Дамініка не заспявала „Начной казкі"? — пытаюцца пасля выступу Дамінікі Козлюк з беластоцкага садка старэйшыя дзеці. — Гэта ж прыгажэйшая песня!

Але Дамініка заспявала, здаецца, больш складаную песню, таму іншага, чым першае месца, яна заняць не магла. У яе ўжо маленькі круг фанатаў, які выдатна падкрэсліў гэта бурнымі апладысментамі. Такіх цікавых неспадзяванак было яшчэ пару.

(працяг будзе)

i_basovka@o2.pl

Вучнёўскія пошукі

Дзеткі з Непублічнай пачатковай школы ў Залуках шукаюць помнікаў даўніны. 29 красавіка мы паехалі на экскурсію ў лес ля Пяшчанік (5 кіламетраў ад Залук), дзе наведалі помнік у памяць неіснуючага сяла Папоўка. Вучні падрыхтавалі знічы, каб запаліць іх на кургане пабітых жыхароў Папоўкі. Пры нагодзе мы даведаліся пра гістарычныя завірухі XX стагоддзя. На помніку мы адчыталі надпіс: „Памяці загінуўшым 8 чэрвеня 1943 г. ад нямецкага войска. Памерла 37 чалавек, а будынкі спалены".

У жывых асталася толькі адна дзяўчынка, якая схавалася ў печы.

Побач убачылі мы валун, пад якім змешчаны ўсе імёны і прозвішчы загінуўшых жыхароў.

Тэкст і фота Альжбеты РАМАНЧУК

Беларусь

Ведаем Краіну ў свеце,
дзе народ беларускі жыве,
сонца амаль у зеніце
і Нёман блакітны плыве.
Усюды родныя прасторы,
красуюцца пагоркі, лугі,
Нарач, другія азёры...
Краявід такі дарагі.
У жыце блакіт васількоў,
вясёла спявае жаўрук,
перагонкі вясенніх вятроў,
аднастайны дзятловы стук.
Залатыя хвалі палёў,
на нівах гудуць трактары,
багатыя Мінск, Магілёў...
Свеціць ярка сонца ўгары.
Сосны высокія з небам
і дубы вяковыя шумяць.
Такога міру нам трэба.
Спакойна салдаты хай спяць.
Нам мудрасць продкі давалі:
Колас, Купала, Скарына...
Сцежку ў свет паказалі.
Багатая ў нас спадчына.
Гусляр на гуслях зайграе,
уздыхне старадаўні курган.
Сумную песню разганяе
зімовай мяцелі буран.
Мы тут запусцілі карэнні,
гады палічыла зязюля.
Для Цябе нашы імкненні,
Беларусь, дарагая матуля!

Ганна РУБАШЭЎСКАЯ
І „д" клас, Агульнаадукацыйны ліцэй імя Браніслава Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім



Зося з першага „а” класа

— 32 —

Доўгі час настаўнікі II Агульнаадукацыйнага ліцэя мучылі вучняў кантрольнымі. Калі нехта хацеў мець добрыя ацэнкі, вымушаны быў зубрыць дзень і ноч. Як дагэтуль у першым „а” класе толькі Тамаш Вярбіцкі здолеў заваяваць пасведчанне з чырвонай палоскай. Дзякуючы таму, што сур’ёзна працаваў увесь год, зараз хлапец мог аддыхацца. Паўлік Пятрушэня не быў захоплены сваёй сярэдняй ацэнкай: 4,5. Ён баяўся, што не атрымае стыпендыі. Таму ён задумаў паправіць ацэнкі па некалькіх прадметах, найперш па гісторыі. Спадар Іванюк абвясціў вучням, што на канец паставіў усім тройкі. Ліцэісты, вядома, абурыліся такой тактоўкай. Чаму ўсе атрымалі тройкі, калі многія добра напісалі кантрольную?

— І я, і вы добра ведаем, што ніхто тут не ўмее на „чатыры”, — сказаў настаўнік і пачаў весці новы ўрок. Паўлік саромеўся пры ўсіх прасіць, каб паправіць ацэнку. Таму ён падышоў да Іванюка пасля ўрока.

— А навошта табе тая пяцёрка?

— Бацькі не дазволяць мне паехаць на канікулы, — зманіў ліцэіст. — Яны думаюць, што гісторыя гэта самы важны прадмет у жыцці.

Апошнія словы ўзрушылі Іванюка. Ён без аглядкі паставіў Паўліку жаданую пяцёрку. І дамовіліся, што Пятрушэня не скажа пра іх размову сябрам. Хлапец не ведаў, што яго тайна высветліцца ўжо на наступным уроку. У час выхаваўчага ўрока Янка Рыбачук адзначыў, што ў Пятрушэні атрымліваецца чырвоны паясок.

— Віншую цябе! — пахваліў ён Паўла. — Я вельмі рады тваёй пяцёрцы па гісторыі...

Калі вучні даведаліся пра пяцёрку, яны прыгадалі апошнюю сустрэчу Пятрушэні з Іванюком. На шчасце ніхто не заносіў прэтэнзій да Паўліка. Хлопцы падумалі, што чырвонай палоскай на пасведчанні ён падлечыць параненае сэрца!

Тэкст: wodorotlenek92@wp.pl
Дызайн: majeszkarowu@tlen.pl

Музыка з кайфам

Прозвішча Рыбак папулярнае не толькі ў Беларусі, але і ў Гайнаўцы. Аказваецца, што і ў Нарвегіі іх не бракуе. Там, аднак, жывуць вельмі папулярныя Рыбакі. А з 16 траўня 2009 года прозвішча Рыбак стала самым папулярным у Нарвегіі. Гэтага дня Аляксандр Рыбак дзякуючы песні „Казка”, якую сам напісаў і выканаў, перамог у конкурсе Еўрабачання. Гэта амаль падарак на дзень нараджэння, бо музыка нарадзіўся 13 траўня 1986 года ў... Мінску. Па паходжанні ён беларус, мабыць, і сёння ён так сябе адчувае, бо і нарадзіўся ў сям'і беларусаў. Аднак ва ўзросце чатырох гадоў Аляксандр разам са сваёй сям'ёй пераселіўся ў Нарвегію. Там вучыўся не толькі мовы, але перад усім ігры на інструментах. Мама — піяністка, бацька — скрыпач. Зразумела, што і Аляксандр, які імя атрымаў па дзеду, іграе на згаданых інструментах.

Дарога да папулярнасці вяла праз шматлікія іншыя поспехі. У 2006 годзе перамог ён у нарвежскім конкурсе талентаў „Kjempesjansen” (гэта нешта накшталт польскіх тэлешоў „Idol” ці „Маю талент”). Перамагае не толькі ў шоў для тэлегледачоў, але таксама ўдзельнічае ў шматлікіх конкурсах у галіне інструменталістыкі. Дзякуючы ўзнагародзе „Anders Jahres Culture Price” стаў канцэртмайстрам найбуйнейшага нарвежскага аркестра маладых „Ung Symfoni”. На сцэне выступаў з самымі выдатнымі музыкамі Нарвегіі, але перад ім адкрываюцца ўжо сусветныя сцэны.

Аляксандр Рыбак на музыцы не спыняецца, раскрывае свае таленты ў іншых галінах мастацтва. У 2007 годзе выступіў як акцёр у спектаклі ў тэатры Oslo Nye Theatre, а ў жніўні гэтага года, прынамсі нарвежцы, пабачаць яго ў карціне „Yohan — Child Wonderer”.

Самі бачыце, што Аляксандр Рыбак не такі сабе звычайны беларус на эміграцыі, а перад усім свядомы свайго таленту малады чалавек, з якім і рыбалка была б напэўна вельмі вясёлай.

i_basovka@o2.pl

Міра ЛУКША

Ялаўка з Ялоўкі

Маладзенькая кароўка,
ялаўка з Ялоўкі,
разышлася так па полі,
як не лётала ніколі:
наўскасяк, і ўлева, і ўправа —
покатам палеглі травы,
сыплюцца пялёсткі кветак —
так шчыруе цёплым летам
маладая ў латкі быська
(імя ў яе — Ірыска).
Імя ў быські — як цукерка,
на вагу або ў паперцы,
таму іменем „каровак”
іх назвалі адмыслова.
Не чакаць жа малачка
ад ялаўкі і ад бычка.
Стане мамай, тады чакай
малака — хоць адбаўляй —
у Ірыскі будзе шмат,
і напоіць акурат
і цалюткую Ялоўку,
Навасады і Цісоўку,
і Залешаны, Зубры,
Луплянку і Ганчары...
Вось выгода ад маленькай!
— Хопіць! Ці ж я
— рэкардсменка?!

Польска-беларуская крыжаванка № 22

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў, дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 18:

Дождж, малпа, шалі, матылёк, каларыт, гіт, цікавасць, рыс, ты. Дух, магія, шалік, татар, шыр, вы, малы, ас, палёт, лік, альт, дарога.

Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі: **Вайцех Лаўрыновіч, Магда Свентахоўская, Уршуля Васілюк, Ілона Ялоза** з Новага Корніна, **Матэвуш Крук, Дагмара Крупа** з Дубін, **Рафал Вакулюк** з Арэшкава, **Эвеліна Ігнацюк** з Чыжоў. Віншуем!



Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Новая Воля па-просту

— Я не знаю ці гэта добра, што нас параўноўваюць з індзейцамі з рэзервацыі, мы ж не жывем у рэзервацыі, — задумваецца Ніна Буйко. — Але гэты альбом вельмі цудоўны і патрэбны, не толькі нам, старым, але перад усім нашым нашчадкам!

— Мы праводзілі праект сярод індзейцаў ды нававольскіх жыхароў, таму і хацелі паказаць здымкі з жыцця абедзвюх грамадскасцей, — тлумачыць свае намеры Барташ Глябовіч, рэдактар альбома „Новая Воля па-просту”.

Але на гэтых здымках жыццё людзей з зусім розных кантынентаў выглядае даволі падобна і хутчэй цешыць тое, што можа нас нешта спалучаць чым дзяліць. А ці слова „рэзервацыя” мусіць мець у гэтым кантэксце значэнне? Не мусіць, тым больш, што альбом паказвае штодзённае жыццё ў малой грамадскасці, яе гісторыю, адносіны паміж пакаленнямі. Пазнаем людзей з самай блізкай перспектывы, не трэба іх змяшчаць у нейкія рамкі. Такі падыход мелі аўтары праекта Барташ Глябовіч і Аліцыя Фронь. Прыехалі да дзяцей, каб крыху падштурхнуць іх да больш актыўнага жыцця ды пазнавання гісторыі свайго месца і продкаў. Аказалася гэта вялікім поспехам, бо заангажаваліся ў праект не толькі дзеці, але і іншыя жыхары Новай Волі. Пасля здымкі, якія былі зроблены ў час праекта, вандравалі на выстаўкі ў Міхалова ці Супрасль. Урэшце з'явіўся альбом, у якім сабраны не толькі фатаграфіі, але і ўся гісторыя, штодзённасць, а можа і будучыня, бачаная вачыма дзяцей. Альбом меў быць вялікай падзеяй. Яго доўга чакалі ўсе асобы, звязаныя з праектам, а прамоцыя мела быць кульмінацыйным момантам ды падвядзеннем вынікаў цэлага працэсу, які запачаткавалі маладыя навукоўцы зусім не звязаныя з Новай Воляй. Колькасці іхняй добрай волі, на жаль, немагчыма пералічыць на падзяку з боку мясцовых персон. Шчырай можа быць толькі ўдзячнасць людзей, якія паявіліся ў нававольскай святліцы ў нядзелю 17 траўня.

— Мы спадзяваліся намнога больш людзей, — кажа Барташ. — Я пазваніў бацюшку, які тыдзень раней, а таксама і ў дзень прэзентацыі меў запрасіць усіх пасля набажэнства. Тады пасля літургіі ўсе павінны з'явіцца, пасядзець, пагутарыць, узяць свой экземпляр.

Аднак гэтага дня царква была закрыта. Не ўсе нават ведалі чаму. Бацюшка Барташа таксама не папярэдзіў, таму і жалю крыху паявілася ў сэрцы рэдактара так вартаснай для Новай Волі публікацыі. Без радасці ў вачах прыехала на прэзентацыю дырэктарка Гміннага асяродка культуры ў Міхалове, які, дарэчы, з'яўляецца сувыдаўцом кніжкі. Аказалася, што ў тым часе бурмістр Міхалова адмовіўся дафінансаваць раней абяцанай сумай грошай гэты альбом, таму доўгі час Барташ шукаў сродкаў, каб урэшце нававольцы паглядзелі на сябе з новай, кніжнай перспектывы. Жалі аднак хутка пераўтварыліся ў радасць ад сустрэчы.

— Спярша трэба зрабіць цеста і гаварыць „Хрыстос воскрэсе” праз паўгадзіны, — чытае фрагменты дзіцячых расказаў рэдактар кнігі — (...) Бацюшка мае такія накруткі ад мухазоляў-не-мухазоляў...

— Ой, не трэба было гэтага змяшчаць, — гучна смяюцца злёгку засаромленыя самыя старэйшыя ўдзельніцы сустрэчы спадарыні Ніна Буйко ды Марыя Асташэўская.

Спадарыні Ніне асобна дзякаваў ініцыятар выдання альбома, бо змешчаны ў ім фрагменты сямейнай сагі аўтарства спадарыні Ніны, а ўсе чорна-белыя здымкі, якія даюць уяўленне старой Новай Волі, гэта яе прыватны архіў, які паўстаў дзякуючы дзядзьку-фатографу. Пераплятаюцца яны з гэтым як сваю Новую Волю бачаць наймалодшыя, бо фатографам было па 8-13 гадоў. Школьная пляцоўка, кукуруза, могілкі, куратнік, царква — з апаратам былі ўсюды. Наведвалі сваіх дзядоў, суседзяў, калег быццам выдатныя фотарэпарцёры, якія затрымлівалі хвіліну і гэта ўсё паказвае альбом „Новая Воля па-просту”.

— Гэта наш шматгадовы солтыс Барыс Мядзведзь, — паказвае на здымкі Агаткі Сікоры і Данеля Буйко спадарыня Марыя. — Дзеці яго сфатаграфавалі, а ён у мінулым годзе памёр, першага лістапада.

— А тут пакойчык Габрысі, пра які яна распавядае, — дадае ўжо іншым тонам.

Альбом прыносіць многім успаміны, але многім людзям гаворыць упершыню пра з'явы і здарэнні ў гісторыі гэтага месца. Здаецца мне, што дзякуючы малым фатографам іх бацькі змогуць пазнаць гісторыю сваёй бацькаўшчыны.

— Чаму такі загаловак? — кажа Барташ. — Людзі часта казалі, што гавораць на простай мове, для іх гэта здавалася вельмі важным. Таму таксама альбом надрукаваны на трох мовах: польскай, англійскай ды беларускай, што якраз мне здавалася неабходным.

Сустрэча людзей „з Польшчы” з жыхарамі Новай Волі зноўку паказала як цэнная для нас наша спадчына. Не трэба ладзіць дакладаў па гісторыі, каб маладыя ёю зацікавіліся (або ад яе адракліся). Часам трэба ўмела заахвоціць, падштурхнуць, даць у рукі фотаапарат і папрасіць зрабіць пару здымкаў. Што можа з гэтага атрымацца? Расказ пра тое, як колюць свіней, як зрабіць просвірку, адкуль узяўся памятны крыж у лесе, што сталася з дзедавым братам, як малітва вылечыла хворага. Гэта сямейнае ды супольнае жыццё жыхароў Новай Волі, якое ў адно сабралі дзеці.

— Кожны раз як прыязджаюць да нас госці, — расказвае горда мама, — сын паказвае ўсе здымкі, якія зрабіў у час гэтага праекта. Мы ўдзячныя, што нашым дзецям давялося пазнаваць сваю гісторыю ў такі спосаб. Ужо заўсёды змогуць пахваліцца такой кніжкай.

Колькі вёсачак у нашым рэгіёне чакае, каб іх адкрыць. Новая Воля мае шчасце, што трапілі туды Барташ з Аліцыяй. Мае шчасце, што пані Ніна Буйко збірае здымкі і піша сагу. Мае шчасце, што хтось яе заўважыў, бо малыя вёскі і яе жыхары гэта не бяльмо ў воку мясцовай ўлады, а яе гордасць і будучыня.

Мінулае Вітава

Цікавую гісторыю мае вёска Вітава (зараз у Дубіцкай гміне Гайнаўскага павета). Паселішча знаходзіцца побач чыгуначнай лініі Гайнаўка — Чаромха, якую пабудавалі ў 1905 годзе. Сваё паходжанне выводзіць аж ад самога вялікага княза Вітаўта (1350-1430). Легенда кажа, што тут на сухім правым беразе рэчкі Арлянкі ў час аднаго з паляванняў у Белавежскай пушчы заначаваў Вітаўт і тое вялікакняжацкае „стойла” дало пачатак сённяшняму сялу.

Паселішча існавала перад 1570 годам. Яго назву — Вітултова і Вітово — каралеўскія чыноўнікі пісалі ў дакументах ад 1661, 1676 і 1772 гадоў. Цяпершнія мовазнаўцы пацвярджаюць яе паходжанне ад імён Віт, Вітаўт.

Дарога, якая вядзе з Вітава ў Пескі, завецца „Стралецкая дарога”, а гэта паказвае на яго сувязь з дзейнасцю тут асочнікаў і стральцоў — колішняй вялікакняжацкай каралеўскай аховы пушчы.

У 1569 годзе за Пескамі праходзіла граніца паміж Падляшшам, якое было ўключана ў Каралеўства Польскае, і Вялікім Княствам Літоўскім. Вітава ў той час знаходзілася на Падляшшы і належала да Бельскай зямлі.

У лесе Загаць, які знаходзіцца на поўдзень ад сяла і цяпер належыць да Бельскага надляснічства, ёсць прасека „Кленіцкі трыб”. Гэта памяць пра колішні вялікі лясны масіў Бельскай пушчы. Прасека вяла некалі да сяла Кленікі.

У ваколіцы Вітава былі непраходная дрыгва і топелі. Гэта захавалася ў назвах палеткаў: Багонэць, Багно, Бродок, Доліны, Затока, Лозіцы, Осіны. Асабліва такімі былі сенажаці. Траву з іх людзі выносілі на плячах мокрыя па пахі.

Вітава „сядзела” на 67 участках, кожны па 28 дзесяцін. Гэта вялікае сяло.

Да старых тутэйшых родаў належаць, між іншым, Баравікі, Нічыпарукі, Петручукі, Сакоўскія, Скепкі, Тамашукі, Федарукі і Хмелі.

Захаваліся дакументы судовага працэсу сялян з 13 вёсак, у тым ліку і Вітава, з Янам Клеменсам Браніцкім, яго эканомам і падляснічым, якія „правы іх (сялян — аўтар) у печку кідаць і паліць кажуць, (...) экзекуцыямі несамавіта мучаць, да прац неслыханых і неабыкнавенных прымушаюць, падарожжа (...) выдумваюць або адкуп за яго даваць змушаюць”. Далей гаворыцца, што эканом Ф. Смагажэнскі народ працавіты некалі таптаў, „кожнаму па 300 кіёў даваць казаў, аж аднаго з іх з акружнасці сваёй да смерці давёў, тым некантэнтны экзекуцыю конну і пехотну наслаў”.

Скарга была разгледжана, у выніку чаго сяляне атрымалі яшчэ ад караля напамінальны ліст, які канчаўся наступнымі словамі: „Запобегаючы тым бунтам і вашай зухваласці, строга пісьмом гэтым другі раз прыказваем, каб усялякія паслугі, паншчыну і дань (...) у належны час уроджанаму эканому і падлеснаму бельскаму (...) выконваць пад цяжкай карай (...) не бараніліся”.

Дадатковай цяжкасцю для сялян была выкупка памешчыцка-царкоўных зямель, „якія даваліся за заслугі” ў семнаццатым і васемнаццатым стагоддзях, з дзяржаўных лясоў, іх карчаванне і сплата даўгоў за атрыманыя надзелы.

На вельмі нізкім узроўні заставалася апрацоўка зямлі. Прымяняліся прымітыўныя прылады: саха з жалезным наканечнікам, баранавалакуша або пляцёнка, серп, цэп і іншыя. Найбольш удасканаленымі сельскагаспадарчымі машынымі былі ў той час конныя малацілкі, якія з'явіліся тут у II палове XIX стагоддзя, спачатку ў памешчыцкіх маёнтках, а потым і ў сялян.

Зямля тут была слабая і людзі раней жылі надта бедна. Дадаткова займаліся працай у лесе. На працу хадзілі перш-наперш ва ўрочышчы Беласмуга, Козіска, Сорокава Поляна, Чорны Бруод у Белавежскай пушчы. Улетку збіралі грыбы ды ягады, а таксама лекавыя травы.

Яшчэ і зараз жыхары Вітава займаюцца пчалярствам. У навакольных лясах можна сустрэць яшчэ сляды колішніх борцяў. Ёсць тут такія „бортныя” дрэвы.

Забалочаныя выганы каля Вітава меліяравалі ў 1959 годзе. У 1992 годзе ў Вітаве пабудавалі водаправод.

(яц)

Пра нашу рэлігію

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

22 мая ў Дыскусійным клубе асацыяцыі АБ-БА ў Беластоку адбылася сустрэча з цыкла „Пагаворым пра...”; гэтым разам гутарка пайшла пра рэлігію. Галоўным апавядальнікам была Анна Радзюкевіч, вядомая на Беласточчыне журналістка і папулярызатарка праваслаўя. Мадэраваў сустрэчу рэдактар Мікола Ваўранюк.

Вядучы прадставіў спадарыню Радзюкевіч як аўтарку шматлікіх праваслаўных мерапрыемстваў міжнароднага рангу, аўтарку каля тысячы артыкулаў у „Праваслаўным аглядзе”, кніг „Сцежкамі праваслаўя” і „На ўсход ад Захаду”, складальніцу школьных падручнікаў па гісторыі і геаграфіі Беларусі і г.д., і г.д.

Цікава было даведацца пра падаплёку выхаду першай са згаданых кніг, якая, як сказаў спадар Ваўранюк, паказала нашу Беласточчыну ў зусім новым ракурсе, паказала яе станоўчыя якасці, якія не заўсёды бачныя з першага погляду нават ейнымі аўтахтонамі. Нагода выдаць кнігу, значыць грошы на такую мэту, выявіліся даволі неспадзявана і трэба было іх укласці амаль маланкава, значыць у такіх тэмпах апрацаваць турыстычны даведнік. Спадарыня Анна аператыўна склікала аўтарскі калектыў, сарганізавала работу. У выніку атрымалася кніга, якая задзівіла нават яе заказчыка з варшаўскага спартыўнага ведамства; ён спадзяваўся, што будзе гэта нешта сярмяжнае, прасцяцкае, згоднае з адмоўнымі стэрэатыпамі пра наша старонне. А ён атрымаў вельмі якасную кнігу, якая стала доказам, што за паўгода можна выканаць якасны выдавецкі заказ. Аўтарка складала яе з думкай пра спадзяваных чытачоў і таму звярнулася за дапамогай да нашых гмін. Але не за спонсарскай падтрымкай, толькі з прапановай куплі таго даведніка. І гміны ахвотна давалі заказы, нават на некалькі дзесяткаў асобнікаў, што дазволіла сабраць уласны грашовы ўклад у гэты праект.

Першым вынесеным на размеркаванне пытаннем пра рэлігію быў падыход веруючага чалавека да царкоўных структур. Анна Радзюкевіч сцвердзіла, што веру і Царкву нельга дзяліць, што складана пагадзіцца з такім меркаваннем, якое кажа, што можна верыць, не ўдзельнічаючы ў царкоўных абрадах. Прыкладам можа быць цыкл багаслужбаў Вялікага посту, якія даюць такое падмацаванне веры, якое немагчыма атрымаць астаючыся ў хаце. Да таго ж святары вельмі часта падказваюць верніку напрамкі верніцкага дасканалення.

У людзей часта ўзнікае вялікая спакуса ацэньваць сваіх святароў, дарэчы так, як і ўсіх іншых людзей. Дакладчыца сказала, што немагчыма чакаць дасканаласці ад святароў, бо калі вернік будзе занадта патрабавальны, тады паяўляецца пагроза адколу яго ад Царквы. Калі мы ўсё празмерна ўспрымаем розумам, тады можам пабачыць шмат чаго, што нам не падабаецца, і мы пачынаем засяроджвацца не на істотным, але на чалавеку, а святара трэба бачыць больш празрыста, ён павінен весці верніка да малітвы. У Праваслаўнай царкве малітва прыняла кананічную форму, усталявалася вякамі, і чалавек не надта можа ў гэты канон умешвацца.

— Калі я пазнаёмілася з Юркам Андраюком, загадчыкам „Артдруку”, ён расказаў пра эпізод, які мяне вельмі ўразіў, — сказала Анна Радзюкевіч. — Ён крыху раней быў у Швейцарыі і зайшоў да сябра, пратэстанцкага святара, а той кажа: „У наступную нядзелю будзеш служыць багаслужбу. Прыдумай план, паводле якога ты будзеш служыць”. Гэта мяне шакіравала. Бо, вось, святар мае нейкую публіку і трэба яму да яе дастасаваць багаслужбу. Гэта ўсё пад чалавека, не пад Бога. У нас выпрацаваная традыцыяй сістэма і мы яе трымаемся. Мне здаецца, што лепш, калі мы менш увагі прысвячаем чалавеку, які канструюе тую багаслужбу, а канцэнтруемся на малітве, на тым, што найбольш істотнае на шляху да Бога. А гэты шлях не толькі ў Царкве: гэта і чытанне духоўнай літаратуры, калі я магу параўнаць тэксты цяперашніх і ранейшых тэолагаў, і святарову пропаведзь.

— Але ж трэба ўлічваць тую рэлігійную глебу, з якой вернік вырас, — заўважыў спадар Ваўранюк. — У маёй царкве вельмі важным было выкананне фармальных рытуалаў, напрыклад, калі ставаць на калені. А гэта дзецям быў стрэс, бо бабулі строга на гэта звярталі ўвагу. Але я хачу звярнуць увагу на адраджэнне царкоўнага жыцця на Усходзе, у Беларусі і Расіі. Мне здаецца, што сёння людзі там замнога ўвагі прысвячаюць вонкавай форме, значыць, там адраджаецца Царква ў такой форме, у якой яна была знішчана ў пачатку XX стагоддзя. Абавязковыя хусткі, полавае размежаванне (мужчыны справа, жанчыны злева) лічу малаістотным анахранізмам, які з рэлігіяй не мае нічога супольнага.

— Я пагаджаюся з гэтым, — адказала дакладчыца, — бо трэба адрозніць сферу абычаю ад веры. Калі, напрыклад, нейкая жанчына адчувае сябе лепш у хустцы, бо яна так можа лепш засяродзіцца на малітве, не думаючы пра прычоску, няхай яна яе апранае. Але бывае наадварот, калі хустка ўсё ссоўваецца з галавы і яе трэба папраўляць; тады лепш было б тую хустку зняць. А пра паводзіны ў царкве, мяркую, цяпер гаворыцца на ўроках рэлігіі. Лічу, што ў нас лепш, свабодней, бо няма таго асуджэння, калі жанчына прыйдзе ў нагавіцах ці без хусткі.

Вядома, Царква на Усходзе адраджаецца яшчэ нядоўга. Калі гэта пачалося ў васьмідзесятых гадах, то многія аптымістычна глядзелі на гэты працэс, што будзе хутка, а мне ўсё здавалася, што гэта працяглы працэс. І лічу, што ўсе дарожкі, усе крыніцы добрыя для мацавання нашай веры.

Чарговым вынесеным на разгляд пытаннем было стаўленне моладзі да рэлігіі на працягу апошніх дваццаці гадоў, ці яно памянялася.

— Мне здаецца, — сказала спадарыня Радзюкевіч, — што хвалююць іх падобныя пытанні. Бывала, што на Грабарку паломнічала многа моладзі, але здараліся сярод яе такія, што прыязджалі быццам у курорт, каб пазабаўляцца. Лічу станоўчым паменшанне колькасці ўдзельнікаў у карысць іх якасці, добра, што яны сутыкаюцца з абмежаваннямі, якія іх ачышчаюць. Найбуйнейшыя паломніцтвы былі пасля пажару Грабаркі, калі бедства мабілізавала, неабавязкова з парыву веры.

Усё ж такі змены адбываюцца, цяпер людзі больш адукаваныя. Варта хаця б звярнуць увагу на розніцу паміж пасляваеннымі манахамі і сённяшнімі. Зараз пасля вайны было на Грабарцы каля дваццаці малаадукаваных манашак. Магчыма, што некаторыя з іх апынуліся там не дзеля рэлігійных мэт, толькі іхнія сем’і маглі іх выдварыць з хат з-за старасці ці нямогласці. А зараз мы, з’яўляючыся ў манастыр, чакаем ад манашак духоўнай стравы, больш якаснай чым ад прыхадскога святара. У сённяшніх манастырах шмат манахаў і манашак мае вышэйшую адукацыю і нават навуковыя званні. Мітрапаліт Сава стараецца даць манахам магчымасць атрымання вышэйшай адукацыі. Цяпер у манастыры не адпраўляюць старых, цяпер у манастыры ідуць адукаваныя маладыя людзі, якія даспелі да гэтага рашэння.

Трэба таксама помніць пра санацыйную спадчыну нашага праваслаўя. Калі ў той час праводзілася рэдукцыя праваслаўных прыходаў, была забарона арганізаваць прыходы ў гарадах, каб паказаць што праваслаўе з’яўляецца рэлігіяй толькі мужыкоў, што яно чужое гораду і інтэлігенцыі; тады дазволілі толькі на прыходы ў Холме і Владаве. І такі быў пасляваенны адпраўны пункт праваслаўя! Але ўдалося нам даволі хутка паказаць, што ў нас таксама ёсць адукаваныя людзі, насуперак склаўшымся ў Рэчы Паспалітай на працягу вякоў стэрэатыпаў пра праваслаўе.

Разглядалася таксама пытанне, ці пасля гадоў папулярызацыі праваслаўя відаць у польскім грамадстве большыя веды на гэтую тэму.

— Вельмі многа цёплых адгалосак на кнігу пра праваслаўе было ад каталіцкіх інтэлектуалаў, — заявіла Анна Радзюкевіч. — Усё ж такі з нашай літаратурай складана прабіцца ў каталіцкае асяроддзе; хутчэй — у параўнанні з гістарычнымі — прабіваюцца туды нашы тэалагічныя апрацоўкі. Напрыклад выдавецтва „Братчык” распаўсюджвае свае выданні ў многія каталіцкія ўстановы, напрыклад, у кляштары. Таксама „Праваслаўны агляд” патрабуюць шматлікія каталіцкія асветныя і культурныя ўстановы.

На сустрэчы былі закрануты і іншыя пытанні, у тым ліку мовы ў Царкве ды люстрацыі; выклікалі яны жывыя адгалоскі слухачоў. Закраналіся таксама і пазарэлігійныя дзялянкі дзейнасці дакладчыцы — апрацоўка школьных падручнікаў.

Сустрэча з Аннай Радзюкевіч была сёлета чацвёртай з цыкла „Пагаворым пра...”, ладжанага Дыскусійным клубам АБ-БА. Раней адбыліся такія мерапрыемствы прысвечаныя адукацыі (у лютым з Ігарам Кузьміным), тоеснасці (у сакавіку з а. Кастусём Бандаруком) і гісторыі (у красавіку з прафесарам Алегам Латышонкам). Пасля канікул прадбачваюцца сустрэчы на чарговыя тэмы.

ЗАПРАШАЕ

ПАГАВОРЫМ ПРА...
(ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ АБ-БЫ)

Месца сустрэч: Пачатковая школа нумар 4 Беласток вул. Чэнстахоўска, 6а,

18. ВЕРАСНЯ 2009:
Пагаворым пра Малую Айчыну
— сустрэча з Дарафеем Фіёнікам, старшынёй Таварыства „Музей Малой Айчыны” ў Студзіводах.

16. КАСТРЫЧНІКА 2009:
Пагаворым пра мастацтва
— сустрэча з Малгажатай Дмітрук, мастачкай, графікам.

13. ЛІСТАПАДА 2009:
Пагаворым пра культуру
— сустрэча з доктар Ленай Глагоўскай, гісторыкам.

11. СНЕЖНЯ 2009:
Пагаворым пра традыцыю і памяць
— прэзентацыя новых „Сейненскіх хронік”, сустрэча з Бажэнай Шрэдэр з Асяродка „Пагранічча” ў Сейнах.

Праект рэалізаваны дзякуючы фінансавай падтрымцы Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства

З велікодным духоўным частункам

Не першы раз гасцюе Цэнтр праваслаўнай культуры ў Беластоку зацікаўленых беларускай культурай і спадчынай. Гасцінныя залы цэнтра (вул. Святога Мікалая, 5) адчыняюцца перад наведвальнікамі — беларусамі і іх сябрамі — перш за ўсё ў час сустрэч арганізаваных Генеральным консульствам Рэспублікі Беларусь у Беластоку. Адмысловыя сустрэчы вабяць духоўнай і цялеснай стравай. 15 мая г.г., у пятніцу ўвечары ў гэты раз прайшлі Велікодныя сустрэчы з Беларуссю, якія сабралі слухачоў на поўную галоўную залу Цэнтра, аздобленую выставай ікон, напісаных навучэнцамі Іканапіснай школы ў Бельску-Падляшскім. Не змог прыбыць мастак, які афармляў „Святое Пісанне для дзяцей", выдадзенае ў Польшчы выдавецтвам „Братчык" два месяцы пасля выдання ў Беларусі.

— „Святое Пісанне для дзяцей" можа быць таксама падручнікам для вывучання беларускай мовы, — звярнуў увагу генконсул Міхал Аляксейчык, які шмат спрыяльнай увагі і высілку прыкладвае для распаўсюджвання ў Польшчы беларускай літаратуры і культуры. — І дзякуючы „Братчыку", з блаславення мітрапаліта варшаўскага і ўсяе Польшчы Савы ды мітрапаліта мінскага і слуцкага Філарэта, патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі беларускія дзеці ў Польшчы могуць атрымаць гэтае цудоўнае ды прыгожае выданне Божага Слова.

Як напісаў 13 сакавіка г.г. мітрапаліт Сава ў блаславленні выдання, прызначанага для дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту: „Святое Пісанне ёсць крыніцай Праўды аб'яўленай Богам, якая асвятляе розум, сэрца і чалавечую душу. (...) Божыя Праўды запісаны на старонках Святога Пісання прыбліжаюць нас да Бога і памагаюць нам зразумець сэнс і цэль нашага жыцця і акрэсліваюць нас у рэляцыі да Бога і другога чалавека". Вялікія праўды Божыя ёсць прыманы таксама дзяцьмі. „Дазвольце дзеткам прыходзіць да Мяне, не перашкаджайце ім, да такіх належыць Царства Божае" і адзначыў, што „гэтае выданне не толькі для дзяцей, а таксама для ўсіх, якія будуць паглыбляць мудрасць Божую ў Ім запісаную". У кнізе біблейскія апавяданні з каментарыем і тлумачэннямі Леаніда Качанкі, а мастацка афарміла яе Антаніна Лапіцкая. Кніга ў Польшчы выдадзена пад ганаровым патранатам Генеральнага консула Рэспублікі Беларусь Міхала Аляксейчыка. Тлумачыцца ў ёй сэнс Святога Пісання, раскрываюцца духоўныя каштоўнасці і высокая культура хрысціянства. Утрымлівае яна больш за 200 ілюстрацый, твораў хрысціянскага мастацтва розных эпох і народаў з сусветна вядомых старадрукаў, храмаў і галерэй. Іканаграфічны іх сэнс тлумачыцца ў „Кароткім даведніку". Кніга можа быць дапаможнікам пры навучанні такіх прадметаў як рэлігія, этыка, рэлігіязнаўства, асновы хрысціянскай культуры, іканаграфія. Можна мець надзею, што спатрэбіцца і будзе з радасцю ўспрынята ў беларускіх школах рознага ўзроўню на Беласточчыне і ў хатах праваслаўных беларусаў.

Выдавецтва „Братчык", Выдавецтва Беларускага экзархата і Духоўна-асветніцкі цэнтр „Спадарожнік хрысціяніна" прадставілі шмат сваіх апошніх дасягненняў. Як з гонарам, на прыгожай беларускай мове, сказаў пра дзейнасць выдавецтва выканаўчы яго дырэктар Уладзімір Грозаў, выдавецтва Праваслаўнага экзархата з'яўляецца найвялікшым асветным цэнтрам Праваслаўнай царквы ў Беларусі. Займаецца яно выдаваннем і распаўсюджваннем кніг, аўдыё- і відэаматэрыялаў, а таксама царкоўнага абсталявання (лампады, панікадзілы, падсвечнікі і інш.), плашчаніц і аблачэнняў на тэрыторыі Беларускага экзархата. Узнагароджана яно шматлікімі прызамі і медалямі за кнігі, між іншым за выданні „Праваслаўныя святы", „Маленькі малітваслоў". Выдае яно мастацкую і дзіцячую літаратуру, навукова-папулярныя кнігі, святаайцоўскія зборнікі, багаслужэбную літаратуру, малітвасловы, літаратуру карысную для душы. З аўдыё- і відэадыскаў можна пералічыць пропаведзі і гутаркі, мультфільмы, запісы царкоўных спеваў, акафістаў, расказы пры жыцця святых. Выдавецтва Беларускага экзархата прыступае да выпуску факсімільнага выдання Слуцкага Евангелля XVI стагоддзя. Выданне выйдзе пад блаславеннем мітрапаліта мінскага і слуцкага Філарэта, па ініцыятыве кіраўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Для выпуску Евангелля вядомым мінскім фатографам Андрэем Шчукіным былі праведзены спецыяльныя здымкі арыгінала. Выпуск кнігі збіраюцца завяршыць у верасні да прыезду ў Беларусь святейшага патрыярха маскоўскага і ўсяе Русі Кірылы. Першаіерарху Расійскай Праваслаўнай Царквы факсімільнае выданне Евангелля будзе прыпаднесена ў падарак.

Хор Выдавецтва Беларускага экзархата „Благавест", які выступіў на Сустрэчах, прыняў удзел у міжнародным фестывалі „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі". Вячаслаў Бабкоў, дырэктар фестывалю сучаснай хрысціянскай культуры „Благавест", прадставіў дзейнасць мінскіх праваслаўных братчыкаў, сваю творчасць як паэта і кампазітара ды павёў выступленне хору „Благавест". Захапіла слухачоў выступленне хору і юнай спявачкі Машы Фішман, лаўрэаткі шматлікіх рэспубліканскіх конкурсаў, а таксама самога дырэктара Вячаслава Бабкова, якога голасу нельга пасаромецца. Слухачы проста кінуліся набыць дыскі юнай спявачкі і хору, цікавіліся таксама кнігамі. Нас найбольш захапіла выданне кнігі Леаніда Маракова „Рэпрэсаваныя праваслаўныя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі Беларусі 1917-1967" у двух тамах, дзе змешчаны не толькі імёны святароў, манахаў, але і прыхаджан (кнігай можна пацікавіцца ў нашай рэдакцыйнай бібліятэцы).

Міра ЛУКША

Беларусь,беларусы...

Беларускі фальклор для многіх людзей з'яўляецца невычарпальнай крыніцай узбагачэння і духоўнага натхнення. Акрамя гэтага, падсілкоўваюцца людзі ад яго і жыццёвай энергіяй, вынікам чаго аказваюцца цікавыя сайты, што з'яўляюцца ў Байнэце.

Сайт фальклорнага праекта, з якім мы сёння пазнаёмімся, пакуль яшчэ не мае якой-кольвек назвы. Таму яго імем стаў адрас у інтэрнэце — www.folk.by. Варта адзначыць, што нядаўняе яго з'яўленне было даволі добра падрыхтавана. Аб гэтым сведчыць тое, што па меншай меры толькі на дзвюх старонках няма інфармацыі. Гэта — „Артыкулы" і „Нашы сябры".

Калі мы зазірнем на гэтую фальклорную бачыну, то ўбачым, што асноўны яе колер — шэры. Падаецца, што такі выбар распрацоўшчыкаў крыху памылковы, бо някідкі колер не надта прыцягвае да сябе ўвагу. Каб зацікавіцца сайтам, трэба зрабіць над сабой хоць маленькае, але намаганне. Калі ж такое намаганне будзе зроблена, то інтэрнэт-карыстальнік атрымае магчымасць азнаёміцца з цікавай інфармацыяй, пададзенай як у выглядзе тэксту, так і ў фотаздымках.

Сайт падзелены на дзве часткі. Першая, левая, утрымлівае пералік рубрык. Іх усяго дзевяць. На галоўнай старонцы месцяцца навіны і паведамленне пра прайшоўшы напачатку мая фестываль традыцыйнай культуры Чарнобыльшчыны.

Прэзентацыя сайта месціцца на старонцы „Аб праекце". „Гэты праект не адбыўся б, каб не нашы бубулі і дзядулі з усіх куточкаў Беларусі, якія праз стагоддзі не толькі пранеслі родныя спевы і музыку, але і зацікавілі імі нас, каб цяпер мы пераймалі гэты каштоўны скарб", — распавядае адзін з аўтараў сайта Алесь Жукоўскі. Пры гэтым ён называе ўсіх, хто непасрэдным чынам натхніў яго на гэтую працу.

„Мы пачынаем з музыкі і спеваў, а хочам паказаць як мага больш бакоў традыцыйнага беларускага ладу. Дай, Божа, каб атрымалася!" — дадае другі аўтар Васіль Грынь.

Наступнай старонкай ідуць „Навіны". Апошняя навіна настолькі неардынарная, што хочацца засяродзіць на ёй асаблівую ўвагу. Гаворка ідзе пра вышэйзгаданы фестываль культуры Чарнобыльшчыны.

Слова „Чарнобыль" ужо даўно перастала быць звычайнай назвай украінскага мястэчка непадалёк ад мяжы з Беларуссю. Цяпер Чарнобыль — гэта імя тэхнагеннай катастрофы, ад якой пакутавалі і надалей пакутуюць людзі, у першую чаргу на беларускай тэрыторыі, каля 70% якой аказалася пад радыеактыўным пылам.

Адзін аспект чарнобыльскай катастрофы, можа не найбольш важны, але даволі сур'ёзны, большай часткай заставаўся ў цені. І гэты аспект — культуралагічны.

Пілотны фестываль традыцыйнай культуры Чарнобыльшчыны быў прысвечаны спевам і музыцы адселеных і пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы тэрыторый. Удзельнікамі фольк-спатканняў сталі 8 гуртоў з Беларусі і 2 гурты з Украіны. Акрамя расповедаў пра іх і слоў падзякі, на сайце месціцца і фотасправаздача незвычайнага фестывалю. На жаль, подпісаў пад фотаздымкамі няма, таму даведацца пра тое, якія менавіта гурты на іх, немагчыма.

Асобную старонку „займае" гурт „Рада". Дарэчы, тут можна не толькі прачытаць аб ім даведачную інфармацыю, але і праслухаць музыку ў яго выкананні.

Уладімір ЛАПЦЭВІЧ

Мары збываюцца

Валейбол — далёка не самы падтрыманы від спорту ў Беларусі. Але пасля траўненьскіх поспехаў айчынных каманд кіраўніцтву айчынным спортам варта задумацца куды лепш варта інвеставаць сродкі. Футбольны барысаўскі БАТЭ — гэта найперш прыватная ініцыятыва, якая забяспечыла феномен, а вось бальшыня іншых хакейных і асабліва футбольных клубаў папросту праядаюць грошы падаткаплацельшчыкаў, не дэманструючы ні належных вынікаў, ні відовішча.

Але вернемся да валейбола. Моладзевая зборная нашай краіны ўпершыню ў гісторыі прабілася ў фінальную частку чэмпіянату свету сярод гульцоў ва ўзросце да 21 года. Для гэтага спатрэбілася пераадолець два кваліфікацыйныя этапы. Апошні раўнд змагання прайшоў у Турцыі, дзе сапернікамі нашых былі гаспадары пляцоўкі, эстонцы і аўстрыйцы. Наша дружына пад кіраваннем галоўнага трэнера Аляксандра Герасімава паспяхова адолела гэты бар'ер. У першым матчы беларусы ўзялі верх у трох сетах над дружынай Аўстрыі — 25:18, 29:27 і 25:18. У другім паядынку супраціў зборнай Эстоніі быў больш сур'ёзны. Але і тут нашы валейбалісты давялі сваю перавагу — 3:1 (22:25, 25:17, 25:19, 25:23). А ў апошні дзень у змаганні з туркамі вырашаўся лёс адзінай пуцёўкі. Летась беларусы ўжо перамагалі нашчадкаў янычараў у еўрапейскай кваліфікацыі. І на гэты раз яны святкавалі поспех, выйграўшы 3:1 (25:16, 22:25, 25:18, 25:15). Ёсць чаканы фінал — мары збываюцца! З іншых краін Еўропы яшчэ такога права дасягнулі праз адбор Бельгія, Расея, Грэцыя і Польшча, а таксама Францыя як пераможца кантынентальнага першынства. На планетарны форум у Індыю прыедуць таксама маладыя валейбалісты Аргенціны, Бразіліі, Канады, Кітая, Кубы, Егіпта, Іраана, Туніса і ЗША. Лёсаванне па групах будзе 17 чэрвеня, а сам турнір пройдзе з 31 ліпеня па 9 жніўня.

Парадавала і жаночая валейбольная дружына Беларусі. Нашы дзяўчаты пад кіраваннем Віктара Ганчарова паспяхова прайшлі сіта другога раўнда да чэмпіянату свету 2010 года. У Азербайджане яны па чарзе расправіліся з нацыянальнымі камандамі Украіны — 3:0 (25:23, 28:26, 25:22), гаспадынь пляцоўкі — 3:0 (25:19, 25:22, 31:29) і Ізраіля — 3:1 (22:25, 25:18, 25:23, 25:17). Сухая вікторыя над азербайджанкамі стала прыемнай нечаканасцю і тым самым беларускі ўзялі рэванш за паразу ў еўракваліфікацыі мінулага года. І гэта нягледзячы на тое, што Беларусь зазнала па розных прычынах істотныя кадравыя страты. Адсутнічалі ажно 5 валейбалістак са складу, які прабіўся на сёлетні еўрачэмпіянат. Жыццё паказала, што надзейны рэзерв ёсць. А лідаркамі зборнай зараз выявілі сябе Кацярына Закрэўская і Ганна Шаўчэнка з баранавіцкага „Атланта", Аксана Кавальчук, якая выступае за клуб з расейскага Ліпецка, Марына Тумас з турэцкага „Фенербахчэ". Будзем спадзявацца, што зборная ўзмоцніцца з вяртаннем у склад пасля траўмы адной з асноўных блакуючых Алены Гендзель, якая значны час выступала за каманду Беластока, а зараз у складзе каманды „Фармуціль" з Пілы (зусім нядаўна стала бронзавай прызёркай польскага першынства). Цяпер наперадзе на шляху ў фінальны турнір, што пройдзе ў Японіі, апошні жорсткі бар'ер. Заданне палягчаецца толькі тым, што з кожнага квартэта спаборнікаў шчаслівыя білеты атрымаюць па дзве каманды. У нашай групе будуць змагацца Італія (арганізатар матчаў), Балгарыя, Беларусь і Чэхія. Гульні адбудуцца 17-19 чэрвеня.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Фота Міхася СЦЕПАНЮКА

Другі кубак „Нівы”

— У гэтым турніры самае важнае не спаборніцтва і саперніцтва, толькі інтэграцыя маладых людзей, — гаворыць Уладзімір Васілюк, настаўнік фізкультуры бельскай „тройкі”.

Якраз у гэтай школе адбываецца турнір па валейболе дзяўчат з гімназій, у якіх выкладаецца беларуская мова. Першая ўзнагарода — кубак „Нівы”, устаноўлены Тыднёвікам беларусаў у Польшчы. Варта падкрэсліць, што не толькі каманда, якая заваюе першае месца, атрымае прыз нашага тыднёвіка. Ніўскімі кубкамі ўзнагароджаны будуць усе спартыўныя калектывы.

Апрача „Нівы” ўзнагароды ў згаданым спаборніцтве ўстанавілі Гарадскі асяродак спорту і адпачынку, рада бацькоў бельскай „тройкі” ды дырэктар бельскага белліцэя, які узнагародзіць лепшую каманду з горада Бельска.

— Турнір школ, у якіх вывучаецца беларуская мова, гэта ідэя нашага сябра Юркі Чыквіна, які ажыццявіў яе год таму, — тлумачыць спадар Васілюк. — У гэтым годзе мы рашылі турнір працягваць.

У спартыўнай зале Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім спаборнічае шэсць каманд. Прадстаўляюць яны гімназіі № 7 з Беластока, з Кляшчэль, № 3 з Гайнаўкі ды Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы з Гайнаўкі. Бельская „тройка” — гаспадар турніру — выставіла дзве каманды: у першай іграюць гімназісткі трэцяга класа, у другой змагаюцца першакласніцы.

— Многія турніры, не толькі спартыўныя, але і культурныя, замест інтэграваць маладых людзей, вельмі часта выклікаюць негатыўныя эмоцыі, — гаворыць дырэктар бельскай „тройкі” Васіль Ляшчынскі. — Мы стараемся, каб вучні проста добра гулялі.

Хаця турнір мае сяброўскі характар, яго ўдзельнікі змагаюцца вельмі амбіцыйна.

— Любім гэты спорт, любім іграць і прысутнічаць на розных спаборніцтвах, — гавораць дзяўчаты з „тройкі”. — Вядома, што файна было б, калі б мы перамаглі і атрымалі прызы.

Апрача спартыўных змаганняў гледачы (у большасці вучні бельскай „тройкі”) у перапынках паміж матчамі маглі паслухаць песень у выкананні школьнага гурту „Капрыс” ды пабачыць лявоніху, якую станцаваў гурт „Світанак”.

Гэта не адзіныя беларускія акцэнты суботняга турніру. Падчас прэзентацыі кожную каманду ўзначальвала дзяўчына, апранутая ў народны строй.

Але ў турніры, які адбыўся 23 мая, прымалі ўдзел вучаніцы, якія не вывучаюць беларускай мовы.

— Прыехалі з намі дзяўчаты, якія, хаця не прысутнічаюць у занятках па беларускай мове, вельмі хацелі зайграць, — гаворыць настаўніца беларускай мовы з гімназіі № 7 у Беластоку Альжбета Руткоўская. — Гэта таксама спосаб інтэграцыі, — дадае.

Удзельнікі сяброўскага турніру спаборнічаюць у дзвюх групах. З першай групы ў паўфінал пераходзіць першая каманда „тройкі” ды гайнаўскі белліцэй. З другой — у далейшай фазе зайграюць гімназія з Кляшчэль ды дзяўчаты з Беластока.

Пасля вельмі роўнага фінальнага матча каманда з Кляшчэль перамагла старэйшых сяброўак з „тройкі” і за першае месца атрымала кубак „Нівы”. Трэцяе месца заняў Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, а чарговыя: гімназісткі з Беластока, другая каманда з Бельска ды гімназія № 3 з Гайнаўкі.

На тварах пераможцаў відавочная зразумелая радасць. Аднак тыя, хто заняў далейшыя месцы, не пераймаюцца. Вядома, самае важнае на турніры не перамога, толькі сустрэча.

Міхась СЦЕПАНЮК

Святкаванні ў пагранічнікаў

Ад двух гадоў праводзілася ў Чаромсе пабудова пагранічнай заставы. Кошт інвестыцыі склаў суму каля дванаццаці мільёнаў злотых. Здача аб’екта ў карыстанне адбылася 15 мая. Не была гэта лакальная імпрэза. Паколькі падзея супадала з 18 гадавінай стварэння войск Гранічнай аховы (ГА), арганізатары надалі ёй ранг ваяводскага мерапрыемства. Па гэтай прычыне Чаромха мела нагоду гасцяваць высокіх гасцей, у тым ліку намесніка міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі Адама Рапацкага, праваслаўнага ардынарыя Войска Польскага архіепіскапа Мірана Хадакоўскага, галоўнага каменданта ГА падпалкоўніка Лешка Эляса, каменданта Падляшскага аддзялення ГА палкоўніка Лешка Чэха, падляшскага ваяводу Мацея Жыўну, парламентарыяў Кшыштафа Путру, Юзэфа Кліма і Яраслава Матвеюка ды шматлікае кола прадстаўнікоў самаўрадавых установаў. У мерапрыемстве ўдзельнічалі прадстаўнікі пагранічных служб Беларусі і Літвы.

Святкаванні пачаліся ў царкве а палове адзінаццатай супольнай малітвай святароў праваслаўнага, каталіцкага і евангеліцкага веравызнанняў. Урачыстасць у царкве ўдастоіў архіепіскап Міран. Разам маліўся дэкан палявога біскупа Войска Польскага ксёндз падпалкоўнік Стэфан Дмох у прысутнасці сцяганосцаў, функцыянераў ГА, гарцэраў і шматлікіх чарамшан. У пропаведзі архіепіскап Міран спаслаўся на традыцыю аховы дзяржаўнай мяжы даўнейшымі фармацыямі, як і задачамі, якія зараз ставіць Еўрасаюз перад функцыянерамі Пагранічнай аховы.

З царквы прысутныя падаліся пад насычальню — на пляцоўку новазбудаванай заставы.

Афіцыйная частка пачалася ў 12 гадзін. У час цырымоніі заслужаным функцыянерам былі ўручаны медалі і прызначэнні на пасады. Адбылося таксама пасвячэнне новазбудавананай заставы. Медалі за заслугі для пагранічнай аховы атрымалі маёр Збігнеў Аўдзей, капітан Яраслаў Аборскі і падпаручнік Марк Палевіч, а залаты медаль за шматгадовую службу — маёр Ежы Чэх і падпалкоўнік Альгерд Місюканіс. Павышэнні ў званні атрымалі 151 харунжы і 95 падафіцэраў. Узнагароджаных павіншавалі віцэ-міністр, галоўны камендант ГА, архіепіскап Міран і маршалак Сената Кшыштаф Путра. У заканчэнні слова ўзяў войт Міхал Врублеўскі, які Міністэрству ўнутраных спраў і адміністрацыі ды ваяводскаму самаўраду выказаў падзяку за падтрымку ў рэалізацыі каштоўнай інвестыцыі і пажадаў, каб чарговай інвестыцыяй стала разбудова пагранперахода ў Полаўцах. Каля трынаццатай гадзіны традыцыйнае перарэзанне стужкі здзейснілі віцэміністр А. Рапацкі, ваявода Мацей Жыўна, галоўны камендант ГА Лешак Эляс, камендант Падляшскага аддзялення ГА Лешак Чэх, войт Міхал Врублеўскі і камендант пагранзаставы падпалкоўнік Канстанты Герман, а пасвяцілі заставу архіепіскап Міран Хадакоўскі і ксёндз Стэфан Дмох. Пасля прысутныя мелі нагоду пазнаёміцца з абсталяваннем, якім штодзень карыстаюцца функцыянеры ГА і сацыяльнымі ўмовамі іх службы. А гэтыя зараз раўняюцца еўрасаюзным стандардам.

Уладзімір СІДАРУК

Фота Уладзіміра СІДАРУКА

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — сербскую пагаворку.

												1	2	3	4
5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
							21	22	23	24	25	26	27	28	29

1. бог холаду ў язычніцкай міфалогіі ўсходніх славян = 10 _ 20 _ 25 _ 24 _;

2. вялікае металічнае прыстасаванне ў розных механізмах для зачэрпвання, разлівання ці высыпання = 27 _ 28 _ 9 _ 4 _;

3. вадкасць, што выдзяляецца ныркамі як прадукт адмену рэчываў = 29 _ 15 _ 21 _ 6 _;

4. засеяны або падрыхтаваны да пасеву ўчастак зямлі = 3 _ 19 _ 1 _ 2 _;

5. буйны лясны драпежнік сямейства кашачых, які водзіцца ў Амерыцы = 5 _ 12 _ 23 _ 8 _;

6. ром, які сваю кабылу хваліць = 13 _ 26 _ 18 _ 17 _ 16 _;

7. хімічны элемент н-р 30 = 14 _ 22 _ 11 _ 7 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 17 нумара

Раён, пожня, аксаміт, Ева, Охаб, Чэ, цыбуліна, улік, мічман, рыла, павет, Ікар, слон, пяро, Хіва, мытня, Прыпяць, пяць, Рыга, куль, Кусінен.

Рашэнне: **Калі чалавек хоча жыць у міры, павінен ён быць сляпы, глухі і нямы.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

„Расспяваны Гарадок” — 55 ад пачатку

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Ужо больш за 55 гадоў таму сталі былі збіраць сёстры Ніна Мушынская і Жэня Савіцкая з Гарадка людзей заварожаных роднай песняй. Стварылі яны проста „Гарадок” — калектыў перш за ўсё жанчын, але і мужчын, якія расславілі Гарадоччыну ў свеце сваімі песнямі, тэатральнымі пастаноўкамі, абрадавамі сцэнкамі, у якіх выяўлялі свае таленты, працавітасць і ўзмацнялі пачуццё тоеснасці сярод беларусаў не толькі сваёй маленькай радзімы. Ужо з 1954 года. Гэта найстарэйшы і найбольш заслужаны беларускі аматарскі калектыў, які з'яўляецца ўзорам для ўсіх іншых — прагучала не раз на юбілейным святкаванні 23 мая ў Гарадку з вуснаў заслужаных дзеячаў беларускай культуры, прадстаўнікоў самаўрадавых і адміністрацыйных улад. Перш за ўсё па-беларуску. Запрошаны былі таксама на святкаванне ўсе сябруючыя з Гарадком калектывы — і з Гарадоччны („Хутар”, „Асенні ліст”, залучанскія „Каліна” і „Калінка”, маладзенькая школьная „Казка”, якая разам са старэйшымі выканаўцамі ва ўзросце сваіх бабуль, а нават і прабабуль, бадзёра выступіла на сцэне), былі з пажаданнямі і „Журавінкі” з Агароднічак, хор „Крыніца” з Беластока, „Васілёчкі” з Бельска, выступіў таксама літоўскі хор „Дзукія” з Пуньска з дырэктаркай Пуньскага дома культуры Астай Пячурыс. Словы падзякі прагучалі з вуснаў прадстаўнікоў БГКТ, арганізацыі маладзейшай ад гарадоцкага калектыву, Генконсульства і Пасольства РБ, гмінных, павятовых і ваяводскіх ды і міністэрскіх улад. Пазайздросціла нават суседняе Міхалова, свежаспечаны горад, вуснамі бурмістра, такога калектыву, які з'яўляецца такім самавітым прамотарам для мясціны. Хвалілі „Расспяваны Гарадок” за жывучасць, трываласць, умеласці, дзякавалі за хвіліны радасці і прыклад. Бо „Расспяваны Гарадок” усё бярэ першыя прызы на фестывалях роднай песні, з'яўляецца ядром усіх мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў Гарадку — усіх „бяседаў”, „дзён”, а нават умее выступіць пад сучасны рытм, скажам, з „РІМАй”... І ўвесь час яны з Гарадоцкім домам культуры імя слаўнага Кастуся Каліноўскага родам з суседніх Мастаўлян (цяпер гэты дом культуры часцей і нецікава завецца Гарадоцкім цэнтрам культуры). Тут заўжды праводзіліся рэпетыцыі, тут месцяцца строі, інструменты, рэквізіты для пастановак ды сцэнічнага афармлення. А сёння падмацоўвае выраз усяго выступлення дэкарацыя Марыі Мялешкі — на сцэне ярка-зялёны луг у шарах дзьмухаўцоў, — спелая вясна. Гэтак як і ўвесь „Расспяваны Гарадок” — сам ён старэе-спее, а для іх час ласкавы.

Пачалася радасная сустрэча хвілінай маўчання — дзень раней загінуў у дарожнай аварыі ўнук харысткі Вольгі Мядзведзевай (памерла яна ў мінулым годзе). Шмат з тых, хто з гарадоцкай песняй, няма ўжо ў жывых. А засталіся яны ў памяці не толькі тутэйшых слухачоў. У час выступленняў спаглядалі яны са здымкаў — чорна-белых і каляровых, якія дэманстраваліся на экране на задняй сцяне гарадоцкай кіназалы. Першыя здымкі — з часу, калі „Гарадок” з'ездзіў на фестываль моладзі і студэнтаў у 1956 годзе ў Варшаву — апрануты ў „рускія” строі, бы ў харыстаў Пятніцкага. Пасля яны ў ільняных самадзелках, атласавым бліскучым стылізаваным адзенні, у строях пашытых ім спецыяльна ў Беларусі, у боціках усялякіх, між іншым, у чабатках падораных ім Лёнікам Тарасэвічам. На сцэне паявілася дзевяць актуальна найбольш занятых працай у калектыве спявачак (дзесятая, Тамара Бурачэўская, паехала ў госці да ўнукаў). Ды ён адзін — Віктар Маланчык з гармонікам. Але сёння быў і ганаровы грамадзянін Гарадка — Сцяпан Копа, які з калектывам трываў 34 гады. Сцяпану Копу не толькі Гарадок заўдзячвае шмат. Збіральнік родных песень падарыў сябрам адзін са сваіх багатых і каштоўных зборнікаў песеннага фальклору з Беласточчыны, паўспамінаў разам з імі былое. Бо было што ўспамінаць — і сумнае, і радаснае. Ніна Цыванюк падрыхтавала напачатак яшчэ адну сцэнку: як яны збіраліся ў 1954 годзе, як гуртаваліся, што выбіралі для спеваў. Маладзейшыя харысткі — Марыся Врублеўская, Галінка Ляховіч, Аліна Гобец, Ніна Харужая, Раіса Дылько, Галена Кот, а і Ірына Паўлючук, якая яшчэ „са старога складу”, прадставілі пасядзелкі ў гарадоцкай бібліятэцы, паказваючы тую першую гронку, з Нінай Мушынскай (у яе ролі Марыя), з Рэняй Гутнік (іграе яе ролю Аня Казбярук) — медсястрой-каталічкай (яна загінула трагічна ў 1955 г.). Надзея Парэмбская, Саша Яроцкая, Вера Кардаш, Люба Севярын... Першая жменька, а пасля іх было і 25. Прагучалі песні, з якімі пачыналі яны сваю кар'еру, і якія спяваюцца да сёння: частушкі, „Баба Еўка, дзед Тамаш”, „Ці свет, ці світае”... Прыгадвалі песні тутэйшыя, спявалі ўсялякія беларускія, ведалі і польскія, і ўкраінскія. Усё свойскія. Адкрывалі таксама тутэйшых творцаў, м.інш. гарадоцкага „нашаніўца” Сцяпана Пятэльскага („Сядзіць голуб на бярозе, галубка на вішні”). І самі пісалі пастаноўкі, вершы, проста з сэрца — пра Гарадок, што рассеўся над Супраслю-ракой, і пішуць да гэтай пары. Сваю літаратурную творчасць развіваюць разам з сябрамі з „Каласоў” — Ніна Цыванюк, Галінка Ляховіч, Марыя Врублеўская. „Мы родам з тых, каго завуць простым народам”, — так спяваюць пра сябе. „Матулін голас спявае песні на роднай мове ў дзяцінства час”. І „толькі цешымся песняй гармоніка”. Песні народныя і тыя, якія сталі народнымі, сантыментальныя, любоўныя, жартаўлівыя, патрыятычныя. А дзе яны не былі? Па ўсёй Польшчы ездзілі, былі ў Беларусі. „Толькі ў... Случанцы не былі!” — жартуе Ніна Цыванюк, якая сваё цалюткае ўжо пераніцаванае сэрца аддала роднай песні, стомленая ад жару пражэктараў і хвалявання. — „А мяне, хоць старэнькую, папацалавалі сёння як ікону!”

Ніна Цыванюк і Сцяпан Копа

Жыве Гарадок!

30.05 — 05.06

(22.03. — 20.04.) Задзівіш усіх адвагай і баявітасцю. Чару і красы дадасць табе Марс аж да 6.06. Грошы прыходзяць (але ад паловы ліпеня чакаць будуць цябе выдаткі). З 5.06. пытайся ў знаёмых пра дадатковую працу. З 4.06 (аж да 2.08.!) — адвага, каб чэрпаць з жыцця тое што найлепшае.

(21.04. — 21.05.) Самаўпэўненасць, стабільнасць у фінансах, перакананне ў добрай будучыні. Асабліва добры час у інтарэсах; за кароткі час заробіш шмат (не азірайся на іншых). Знакамітая пара на выяўленне пачуццяў — з 5.06. (аж да 5.07.). Адно не дай уцягнуць сябе ў ніякую фінансавую піраміду, не вер супепрамоцыям ці суперкрэдытам.

(22.05. — 22.06.) Фінансавы ўраджай, летам на рахунку паявіцца круглая сума. Вельмі мілая атмасфера сярод сяброў. Аж да 21.06. пераканаешся ў сваіх перавагах, пазбудзешся комплексаў і адважна глянеш у будучыню. Ты — каваль уласнага лёсу, і на ўсё мусіш зарабіць сам.

(23.06. — 23.07.) У канцы мая завяршы ўсе важнейшыя справы. Разведзеныя Ракі: не ўваходзьце ў тую самую раку! Змагайся перш за ўсё за свае грошы. З 4.06 (аж да 2.08.) будзеш ведаць як пільнаваць свайго. Пасля маёва-чэрвеньскага крызісу ўсё паправіцца.

(24.07. — 23.08.) Не бойся ніякіх экзаменаў — падрыхтуешся вельмі добра, а мозг будзе працаваць ціп-топ. Будуць цябе проста расхопліваць! Задзівіш усіх кемлівасцю, ведамі, гумарам. А калі хто трапіць табе ў вока, знойдзеш спосаб, як захапіць яго сэрца.

(24.08. — 23.09.) У гэтае лета нечакана возьмешся за такія вырашэнні, якія адменяць тваё жыццё на лепшае. Знакаміты досціп і інтэлігентнасць дапамогуць табе справіцца з кожнай сітуацыяй. Да канца мая лепш табе не ўваходзіць у дарогу! Можа падвесці цябе сябра з доўгім языком.

(24.09. — 23.10.) Нечаканыя парывы сэрца могуць перакуліць тваё жыццё. Але на хвіліну. Нават з найбольшага замяшання вынікне штосьці добрае для цябе. Можаш перамагчы свае шкодныя звычкі. Спакойна на працы, у школе.

(24.10. — 22.11.) Не ўваходзь у непатрэбныя спрэчкі. Не мусіш даказваць іншым, чаго ты варты; рабі сваё. А за што возьмешся — мураваны поспех. Змабілізуйся і прыкладзіся да спраў з 31.05 (аж да 6.07.!) — будуць найлепшыя вынікі. Рушыцца важная для цябе справа. Ты проста вулкан энергіі! З 4.06. (да 14.06.) — распазнаеш ворагаў, асабліва ў новай кампаніі. Збалансуй дыету.

(23.11. — 22.12.) Больш трэба будзе пастарацца на працы, але і вынікі будуць немалыя. У чэрвені рыхтуюцца вялікія перамены. Кінь сумненні, — справы пойдуць як па масле. З некаторымі сваякамі трэба будзе абыходзіцца як з яйкам.

(23.12. — 20.01.) Спрыяе табе шчасце, не бойся параз. Трымайся абранага курсу і не рассейвайся драбязой. Можаш пазнаёміцца з кімсьці прыцягальным; пачуццё, якое заквітнее, мае шанц перетрываць усе буры.

(21.01. — 19.02.) Будзеш у супернастроі, справішся з тым, што іншым рэдка ўдаецца. Мноства нагод, каб здзейсніць свае мары, нават зусім фантастычныя. Але можаш абярнуцца на пяце і зусім адмяніць напрамак, пазбавіцца таго, што цябе абмяжоўвае.

(20.02. — 21.03.) У канцы мая крыху горшы настрой, праблемы ў фінансах, але гэта хутка міне. Але затое крэатыўнасць, кемлівасць дазволяць табе зрабіць на іншых павальнае ўражанне. Шэраг поспехаў; зрэалізуеш планы, ужо спісаныя на страты. Малая параза на пачатку чэрвеня не знеахвоціць цябе да захадаў за ўзмацненне тваёй прафесійнай пазіцыі.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960